ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ
ГРАМАДСКАЕ АБ'ЯДНАННЕ МАЛАДЫХ НАВУКОЎЦАЎ
"ВІТ"

# ПРАВА
# НА КОЖНЫ ДЗЕНЬ

# ПРАВА
# НА КОЖНЫ ДЗЕНЬ

## ПАДРУЧНІК

## ЧАСТКА ПЕРШАЯ

Мінск, 2005


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

УДК 341.9
ББК 67.620 (4Б)
П 90

П 90 **“Права на кожны дзень”: Падручнік / Н. Клімчук, І. Кузьмініч, С. Салей і інш. - Мінск, 2005. - 81 с.**

УДК 341.9
ББК 67.620 (4Б)

© Гродзенскае абласное грамадскае
аб’яднанне маладых навуокўцаў “ВІТ”, 2002-2005

# ЗМЕСТ

ПРАВІЛЫ .......... 5

САЦЫЯЛЬНЫЯ НОРМЫ .......... 12

ПРАВАВЫЯ І НЕПРАВАВЫЯ ЗАКОНЫ .......... 20

ЯК СТВАРАЮЦЦА ЗАКОНЫ .......... 28

ЯК ВЫКОНВАЮЦЦА ЗАКОНЫ. АБСКАРДЖАННЕ НЕЗАКОННЫХ ДЗЕЯННЯЎ ЧЫНОЎНІКАЎ .......... 36

ЯК МОЖНА ПАЎПЛЫВАЦЬ НА ЗМЕНУ ЗАКОНА .......... 44

ЗВАРОТ ДА ЮРЫСТА .......... 52

СУДОВАЯ АБАРОНА .......... 60

ВЫРАШЭННЕ КАНФЛІКТАЎ .......... 68





*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

# ПРАВІЛЫ

***Ці даводзілася Вам калі-небудзь усталёўваць правілы ці падпарадкоўвацца правілам, усталяваным іншымі? Кожны дзень, калі мы прасынаемся, калі ідзем у школу, працуем ці забаўляемся з сябрамі, мы сутыкаемся з вялікай колькасцю правілаў, часам, нават, не заўважаючы, як іх выконваем ці парушаем. Ці варта ўвогуле падпарадкоўвацца правілам? Што такое правіла, хто і для чаго ўсталёўвае і змяняе правілы? Пра ўсё гэта пойдзе гаворка ніжэй.***

Ўсё наша жыццё, з дня нараджэння і да самай смерці ўладкоўваецца правіламі. У свеце існуе велізарная колькасць правілаў. Іншая назва якіх - нормы ці законы.

## ПРАВІЛА = НОРМА = ЗАКОН

Усе правілы можна ўмоўна падзяліць на тры групы. Да першай групы адносяцца прыродныя правілы, якія іначай яшчэ называюцца **законамі прыроды**. Гэта законы, дзякуючы якім, зіма змяняе восень, збіраюцца хмары і ідзе дождж, усё нараджаецца і памірае. Гэтыя правілы склаліся задоўга да ўзнікнення чалавека і дзейнічаюць незалежна ад таго, ведае іх чалавек ці не. Нават неведаючы гэтыя правілы, чалавеку надзвычай цяжка іх парушыць (напрыклад, законы гравітацыі). Не толькі чалавек, але і ўсё ў свеце існуе на падставе і дзякуючы гэтым правілам.

Да другой групы адносяцца так званыя **тэхнічныя нормы** - гэта правілы паводзінаў людзей з рознымі тэхнічнымі прыладамі, граматычныя правілы і інш. Гэтыя правілы вынаходзяць і ўсталёўваюць самі людзі, паступова накопліваючы досвед і веды, ўсё больш і больш даведваючыся аб прыродзе. Чалавеку варта выконваць гэтыя правілы, калі ён хоча быць цывілізаваным, культурным, і калі ён не хоча выглядаць неадукаваным.


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

Да трэцяй групы адносяцца правілы паводзінаў людзей у грамадстве, яны называюцца **сацыяльнымі** (ад лат. socialis – грамадскі) **нормамі**. Сацыяльныя нормы - правілы – гэта інструкцыі па паводзінах людзей у грамадстве. Гэтыя інструкцыі ўсталёўваюць, як чалавек павінен паводзіць сябе сярод іншых людзей. Сацыяльныя правілы заклiканы абараняць нашыя правы і інтарэсы, павінны ствараць умовы для павышэння ўзроўня нашага жыцця і спрыяць развіццю чалавека. Менавіта такія спецыфічныя мэты сацыяльных правілаў-нормаў робяць іх важнымі ў нашым жыцці. Парушэнне сацыяльных правілаў-нормаў робіць цяжкім ці немагчымым сумеснае жыццё людзей у грамадстве. Далей мы будзем разглядаць менавіта гэтыя, сацыяльныя, нормы.

**А.** Кожнае грамадства, якое калі-небудзь існавала, разумела неабходнасць існавання правілаў. Гэтыя правілы могуць быць незапісаныя і існаваць у вуснай форме, як правілы паводзінаў у нашых сям'ях, альбо могуць запісвацца, напрыклад як правілы паводзінаў у ліфце. На Беларусі не толькі ў дагістарычныя часы, але яшчэ ў часы Вялікага княства Літоўскага, большасць сацыяльных нормаў-правілаў, згодна з якімі жыло сярэднявечнае грамадства, была незапісаная і называлася **звычаямі**. Толькі ў XVI стагоддзі частка гэтых звычаяў была зафіксавана ў спецыяльных зборніках законаў – Статутах.

Яшчэ ў старажытнасці беларусы верылі, што правілы паводзінаў людзей у грамадстве ўведзены язычніцкімі багамі, якія атаясамліваліся з прыродай, а пасля прыняцця хрысціянства – Богам. Сёння лічыцца, што правілы паводзінаў для людзей усталёўваюцца самімі людзьмі. Сучаснае грамадства пабудавана такім чынам, што на час дае некаторым людзям, напрыклад, бацькам, настаўнікам, гарадскім уладам ці дэпутатам, адпаведнае права казаць іншым, як паводзіць сябе ў пэўных выпадках ці сітуацыях, і такім чынам усталёўваць правілы.

Бацькі маюць права ўсталёўваць правілы ў сваёй сям'і. Гэтыя правілы павінны ствараць бяспечныя ўмовы для развіцця дзяцей.

Дэпутаты, якіх выбіраюць у парламент, маюць права ўсталёўваць асаблівыя правілы для ўсяго грамадства – законы. Дзеці самі ўсталёўваюць правілы, асабліва, калі яны гуляюць у гульні. Правілы патрэбны для гульні, яны робяць гульню цікавай і справядлівай. Калі хто-небудзь не гуляе па правілах – ён псуе гульню для ўсіх удзельнікаў. Без правілаў у грамадстве, таксама як і ў гульне, існавала б бязладдзе.

*ТАБЛІЦА 1*

| ВІДЫ ПРАВІЛАЎ | НА ФУТБОЛЬНЫМ ПОЛІ | У ХАЦЕ | У КРАМЕ |
|---|---|---|---|
| *НА ЧЫМ БАЗУЮЦЦА* | Зручнасць, прыгажосць гульні | Разуменне карыснасці, зручнасці і традыцыі | Справядлівасць |
| *ХТО ЎСТАЛЁЎВАЕ ПРАВІЛЫ* | Міжнародныя і нацыянальныя футбольныя арганізацыі | Бацькі | Дзяржаўныя органы |
| *ДЗЕ ПРАВІЛЫ ЎТРЫМЛІВАЮЦЦА* | Запісаныя правілы гульні ў футбол | Свядомасць (розум) бацькоў і сваякоў | • Законы;<br>• Правілы гандлю |
| *ХТО ЗДЗЯЙСНЯЕ КАНТРОЛЬ ЗА ВЫКАНАННЕМ ПРАВІЛАЎ* | Спецыяльна падрыхтаваныя футбольныя суддзі | Бацькі ці старэйшыя ў сям'і | • Пракуратура;<br>• міліцыя;<br>• суд і г.д. |
| *ШТО ПРАВІЛЫ КАНТРАЛЮЮЦЬ* | Паводзіны ўдзельнікаў на футбольным полі падчас гульні | • Паводзіны ў сям'і;<br>• адносіны паміж старэйшымі і малодшымі ў сям'і;<br>• выкананне хатніх абавязкаў | Паводзіны ў краме |
| *ПАКАРАННЕ ЦІ САНКЦЫЯ ЗА ПАРУШЭННЕ ПРАВІЛАЎ* | • Жоўтая картка (папярэджанне);<br>• чырвоная картка (выдаленне з поля);<br>• пенальці, штрафны ўдар і г.д. | • Мукі сумлення;<br>• забарона прыходзіць да хаты позна;<br>• забарона сустракацца з сябрамі | • Дысцыплінарнае пакаранне (вымова, пазбаўленне прэміі і г.д.);<br>• штрафы;<br>• турэмнае зняволенне |

Правілы гульні і правілы, на падставе якіх дзейнічае грамадства, могуць значна адрозніваццa зместам, але яны аднолькавыя па сваіх мэтах: як сацыяльныя правілы, так і правілы гульні, павінны садзейнічаць стабільнасці і справядлівасці, ствараць роўныя ўмовы для ўсіх удзельнікаў. Акрамя гэтага, правілы гульні, правілы, пануючыя ў сям'і ці ў краме, будуюцца на аднолькавых прынцыпах дзейнасці.


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

**Сярод асноўных прынцыпаў, па якіх дзейнічаюць правілы, можна назваць наступныя:**

1) Правілы павінны адпавядаць агульнапрынятым крытэрыям (пра крытэрыі добрага правіла пойдзе гаворка ніжэй) і разглядацца большасцю як карысныя ці неабходныя;

2) Звычайна той, хто ўсталёўвае правіла, мае права змяніць ці ўвогуле адмяніць яго, але ўдзельнікі маюць права паўплываць на прыняццё, змену ці адмену правіла (глядзі таб. №1);

3) Змяняць ці адмяняць правілы можна толькі ў выпадках, якія апісаны ў саміх правілах, і на падставе гэтых правілаў;

4) Акрамя таго, што мы самі маем права сачыць за правільным выкананнем правілаў, звычайна існуюць спецыяльныя асобы, ці арганізацыі і ўстановы, якія спецыяльна створаны, каб сачыць за іх правільным выкананнем. Калі мы знаходзім парушэнні правілаў, то мы маем права звярнуцца да гэтых упаўнаважаных асоб ці ўстаноў, а іх абавязак – выправіць сітуацыю (глядзі таб. №1);

5) Для таго, каб недапусціць парушэння правіла, а таксама за яго парушэнне звычайна ўсталёўваецца пакаранне (глядзі таб. №1).

**Б.** Важнасць правілаў не азначае, што ўсе правілы справядлівыя ці добрыя. Часам нам не падабаецца тое ці іншае правіла. Ці даводзілася вам калі-небудзь казаць: “Мне не падабаецца гэтае правіла”? Што можа дапамагчы нам сказаць, што нейкае правіла з'яўляецца “добрым”, а другое “дрэнным”? Крытэрыямі для аналізу правіла могуць быць наступныя:

**Крытэрыі добрага правіла**

**Добрае правіла павінна быць:**

**1) справядлівым**
**2) простым для разумення**
**3) рэальным для выканання**
**4) напісаным простай мовай**
**5) зразумелым у плане таго, што чакаецца ў выніку выканання правіла**
**6) вядомым людзям, якія яму падпарадкоўваюцца**
**7) несупярэчлівым з іншымі правіламі**
***8)* прадугледжваць пакаранні, якія адпавядалі б узроўню нанесенай шкоды і ўсведамленню небяспекі такіх дзеянняў для грамадства.**


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

Згодна з вышэй пададзенымі крытэрыямі ўсе правілы можна ўмоўна падзяліць на "добрыя" і "дрэнныя". Добрыя, ці дасканалыя, правілы – гэта тыя, якія адпавядаюць крытэрыям добрага правіла. Дрэнныя, ці недасканалыя, – гэта тыя, якія не адпавядаюць хаця б **аднаму** з крытэрыяў.

Існуюць розныя прычыны, чаму тыя ці іншыя правілы могуць стаць недасканалымі, мы спынімся на трох, з нашага пункту гледжання найбольш важных:

1. Правіла прынятае ў выніку памылкі таго, хто яго ўсталяваў, альбо свядомага парушэння заканадаўцам крытэрыяў добрага правіла.

2. Правіла часам можа быць прынята згодна з інтарэсамі абмежаванага кола людзей, якія могуць супярэчыць агульным поглядам і парушаць правы большасці грамадзян. *Так, напрыклад, бальшавіцкая ідэя дыктатуры пралетарыяту, згодна з якой уся ўлада павінна знаходзіцца толькі ў руках пралетарыяту і сялянскай беднаты, ляглі ў аснову Канстытуцыі БССР 1919 года. Гэтая Канстытуцыя пазбаўляла палітычных правоў, а заканадаўства падвяргала рэпрэсіям значную частку грамадства: прадпрымальнікаў, заможных сялян, духавенства і іншыя катэгорыі насельніцтва.*

3. Старэнне правіла ў выніку яго доўгага існавання, альбо ўзнікненне новых крытэрыяў добрага правіла, якія таксама як і ўсё на зямлі, некалі нараджаюцца, жывуць, старэюць і пазней паміраюць. *Напрыклад, у раннім сярэднявеччы ў беларусаў існавалі звычаі кроўнай помсты. У тыя далёкія часы, калі дзяржава не мела сваіх органаў міліцыі, развітага суда, гэтыя звычаі былі карыснымі, таму што стваралі ўмовы, пры якіх чалавек, які здзейсніў злачынства, не мог пазбегнуць пакарання. Але разам з развіццём дзяржавы, пашырэннем хрысціянскай рэлігіі і змены паняцця справядлівасці старыя звычаі былі адменены, як шкодныя. Згодна з новымі правіламі кроўная помста была забаронена, а той хто*



©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

*помсціў самастойна, разглядаўся як злачынца. Функцыю пакарання ўзяў на сябе суд.*

Паколькі правілы для грамадства ўсталёўваюцца людзьмі і ад імя людзей, то толькі ад нас залежыць якія правілы будуць існаваць, а якія змяняцца і скасоўвацца.

**B.** Аднаго адчування, што тое ці іншае правіла з'яўляецца недасканалым, недастаткова для таго, каб вырашыць, як паступаць з ім – трэба яму падпарадкоўвацца, ці лепей было б яго змяніць ці адмяніць. Вельмі важна знайсці аргументы, чаму мы хочам змяніць ці адмяніць пэўнае правіла. Пратэставаць правіла на "недасканалась" можна з дапамогай наступнай табліцы.

*ТАБЛІЦА 2*

| Пытанні | Адказы |
|---|---|
| 1. Якое правіла павінна быць прааналізавана? | |
| 2. У чым сутнасць правіла? (якая праблема павінна быць урэгулявана гэтым правілам) | |
| 3. Ці існуюць іншыя, лепшыя шляхі для урэгулявання ці вырашэння дадзенай праблемы акрамя прыняцця гэтага правіла? | |
| 4. Што адбудзецца (якія эфекты будуць) у выніку прыняцця дадзенага правіла? | |
| 5. Якія моцныя і слабыя бакі мае правіла? Ці з'яўляецца правіла:<br>• справядлівым;<br>• простым для разумення;<br>• рэальным для выканання;<br>• напісаным простай мовай;<br>• зразумелым у плане таго, што чакаецца ў выніку яго выканання<br>• несупярэчлівым з іншымі правіламі;<br>• вядомым людзям, якія павінны яму падпарадкоўвацца;<br>• такім, што прадугледжвае пакаранні, якія адпавядаюць узроўню нанесенай шкоды. | |
| 6. Як вы лічыце, дадзенае правіла павінна быць а) прынята; б) захавана ў гэтым выглядзе; в) зменена; г) адменена? Чаму? | |


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

Пры дапамозе дадзенага механізма аналіза правіла значна прасцей знайсці аргументы "за" і "супраць" існавання таго ці іншага правіла.

Такім чынам, мы высвятлілі, што сацыяльнае правіла – гэта норма паводзінаў, якая ўсталявана людзьмі для таго, каб людзі маглі жыць разам у супольнасці. Чалавечае грамадства не можа існаваць без правілаў. **Асноўнай задачай** правілаў з'яўляецца абарона чалавека і стварэнне ўмоў, у якіх чалавек мог бы развівацца. Для таго, каб дасягнуць гэтых задач, правілы павінны адпавядаць выпрацаваным за тысячагоддзі агульнапрынятым крытэрыям. Для таго, каб абараніць тых людзей, якія падпарадкоўваюцца добрым правілам, за іх парушэнне ўсталёўваецца пакаранне. Але не кожнае правіла можа быць добрым ці карысным. Паколькі людзі самі прымаюць правілы, то яны маюць права і змяняць ці адмяняць іх, калі яны, на іх думку, перастаюць быць добрымі ці карыснымі. Таксама варта памятаць пра правілы змены правілаў ці іх адмены. Прычым, любы чалавек можа паўплываць на змену правілаў і гэтыя змены павінны будуць прызнаны неабходнымі і карыснымі, калі будуць абгрунтаванымі і праведзенымі па правілах змены правілаў.

**Хатняе заданне:**

1. Абярыце адно з правілаў паводзінаў вучня ў школе, прапанаваных на занятку.
2. Правядзіце даследванне абранага вамі правіла згодна наступных пытанняў:
   - Прычыны, па якіх ўсталявана гэтае правіла?
   - Чаму вучні падпарадкоўваюцца гэтаму правілу? Што ці хто прымушае іх выконваць гэтае правіла?
   - Хто можа ўплываць на змену гэтага правіла і пры якіх умовах?
3. Прааналізуйце абранае вашай групай правіла згодна з табліцай №2. Абгрунтуйце свой адказ.


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

# САЦЫЯЛЬНЫЯ НОРМЫ

***Урэгуляваць такі складаны механізм, якім з'яўляецца грамадства, значна цяжэй, чым урэгуляваць такую гульню, як, напрыклад, футбол. Можна ўмоўна сказаць, што ў грамадстве паралельна і адначасова адбываецца вялізарная колькасць гульняў, якія то перакрыжоўваюцца, то перашкаджаюць адна адной, але заўсёды ўзаемазалежаць. Ня дзіва, што і правілы адной гульні таксама перасякаюцца з іншымі і значна ўплываюць на іх. Якім чынам адбываецца ўзаемадзеянне розных сацыяльных правілаў мы разгледзім у гэтай главе.***

**А.** Чаму ў грамадстве існуюць розныя сацыяльныя нормы? Возмем да прыкладу шматпавярховы дом, які складаецца са сцен і пераходаў, сістэмы водаправода, электрычнай сеткі, сістэмы ацяплення, тэле- і радыёсетак і г.д. Усе гэтыя сістэмы значна адрозніваюцца адна ад адной і выкарыстоўваюцца згодна з прынцыпова рознымі правіламі пабудовы і эксплуатацыі. Правілы эксплуатацыі дома не могуць быць аднастайнымі і аднолькавымі для ўсіх сістэмаў. Напрыклад, цяжка сабе ўявіць, каб па правілах падачы электрычнасці дзейнічаў газаправод. Правілы эксплуатацыі дома складаюцца з сукупнасці правілаў эксплуатацыі ўсіх сістэмаў, якія існуюць у такім будынку.

Грамадства - гэткі ж складаны механізм. Чалавек павінен падпарадкоўвацца правілам згодна з яго месцам у грамадстве: у сям'і – бацькі, сына ці жонкі; на працы - бізнэсмэна ці рабочага і г.д. Сацыяльныя правілы іначай называюцца сацыяльнымі **нормамі**, ад слова нармальны, добры, карысны – што азначае паводзіны чалавека ў нейкай сітуацыі, прымальныя для большасці грамадства. Людзі паступова прыйшлі да разумення таго, што для сумеснага жыцця яны павінны паважаць іншых, не могуць забіваць адзін аднаго ці беспадстаўна адбіраць тое, што здабыў ці зрабіў іншы.

**Сацыяльная норма – гэта правіла паводзінаў чалавека ў грамадстве.**


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

Сярод найбольш пашыраных сацыяльных нормаў, з якімі мы з вамі сутыкаемся штодня, можна назваць **маральныя, рэлігійныя, прававыя, эканамічныя, палітычныя норм**ы. Але далей мы спынімся на разглядзе толькі маральных, рэлігійных і прававых нормаў і іх узаемасувязі.

**Маральныя нормы** з'яўляюцца найбольш пашыранай групай нормаў, якія ўрэгулёўваюць вялізную колькасць адносінаў. Яны рэгулююць адносіны паміж бацькамі і дзецьмі ў сям'і, паміж сябрамі, усталёўваюць правілы паводзінаў падчас таго, як мы харчуемся, спім, размаўляем.

Маральныя нормы – гэта правілы паводзінаў, якія перадаюцца ад аднаго пакалення другорму ў выглядзе трыдыцыяў і звычаяў і, звычайна, не друкуюцца ў выглядзе спецыяльных зборнікаў, а ўтрымліваюцца ў асобных літаратурных творах, газетах, прымаўках і прыказках, свядомасці кожнага чалавека. Грамадства і кожны асобны чалавек сваімі штодзённымі паводзінамі бесперапынна ўдзельнічае ў падтрыманні маральных нормаў і здзяйсненні кантроля за іх выкананнем. Мы прытрымліваемся маральных нормаў, як правіла таму, што не хочам у сваіх вачах выглядаць горшымі, чым самі пра сябе думаем. Цяжка сказаць, што чалавека больш стымулюе – боязнь асуджэння іншымі людзмі ці самім сабой.

*Маральныя нормы вельмі істотна ўплываюць на фармаванне іншых сацыяльных нормаў і цесна звязаны з імі. Частка маральных нормаў была замацавана рэлігіяй і, нават, утрымліваецца ў рэлігійных кнігах. Напрыклад, маральныя нормы, якія кантралююць чалавечыя парокі, утрымліваюцца ў прытчы аб братах Каіне і Авеле, дзе адзін забівае другога з-за зайздрасці. Мараль таксама ляжыць у аснове вялікай колькасці прававых нормаў. Напрыклад, маральныя нормы любові і павагі да бацькоў і бліжэйшых сваякоў, пакладзены ў аснову прававых нормаў, якія дазваляюць не даваць паказанні ў судзе супраць бацькі, ці маці, мужа ці жонкі, родных братоў ці сясцёр, калі гэтыя звесткі могуць ім нашкодзіць.*


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

**Маральныя нормы – сістэма нормаў, заснаваных на разуменні дабра і зла, пануючым у грамадстве згодна з гістарычнымі, культурнымі і іншымі асаблівасцямі народа.**

Другой вялікай групай сацыяльных нормаў з'яўляюцца **рэлігійныя нормы**. Яны асобна выпрацоўваюцца кожнай рэлігіяй (каталіцкай, праваслаўнай, пратэстанцкай, мусульманскай, будысцкай і інш.) і з'яўляюцца абавязковымі толькі для веруючых. Веруючы лічыць, што жыць добра, шчасліва і заслужыць вечнае жыццё – значыць жыць згодна з рэлігійнымі нормамі.

Веруючы чалавек выконвае рэлігійныя нормы паколькі верыць, што любое, нават самае дробнае, парушэнне не застанецца не заўважаным Богам і ён будзе пакараным. Асаблівасцю рэлігійных нормаў з'яўляецца і тое, што пакаранне можа накладацца не толькі за здзяйсненне нейкага забароненага царквой учынку, але і за самі думкі аб такой магчымасці. Так у іудзеяў, хрысціян і мусульман сама думка аб магчымасці здрадзіць блізкаму, скрасці ці нашкодзіць суседу з'яўляецца грахом і будзе пакарана.




*Найбольш цесныя сувязі рэлігійныя нормы маюць з маральнымі, паколькі мараль і рэлігія маюць аднолькавыя задачы – яны ствараюць умовы для самаўдасканалення чалавека. Разам з тым, рэлігійныя нормы значна паўплывалі і ўплываюць сёння на фармаванне прававых нормаў. Асабліва моцна гэты ўплыў адчуваецца ў нормах шлюбна-сямейнага права. Ідэя царквы, што шлюб заключаецца на нябёсах, а муж і жонка складаюць адзінае цэлае, была адлюстравана ў сярэднявечным праве як юрыдычная забарона разводаў, а здрада пачала разглядацца як крымінальнае злачынства. У мусульманскіх краінах, пад уплывам рэлігійных нормаў ўзаконена шматжонства, а, напрыклад, у Непале, у некаторых плямёнах – шматмужаства.*


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

**Рэлігійныя нормы - сістэма абавязковых для веруючага чалавека правілаў паводзінаў, выкананне якіх вядзе да выратавання душы ці самаўдасканалення чалавека.**

Трэцяя група нормаў - **прававыя нормы**. Яны ўзніклі разам з дзяржавай. У адрозненні ад маральных і рэлігійных, прававыя нормы, акрамя асабістых перакананняў у неабходнасці падпарадкоўвацца правілам, маюць спецыяльныя "знешнія" установы: міліцыя, пракуратура, суд і іншыя дзяржаўныя структуры, якія могуць прымушаць тых, хто не хоча выконваць прававыя нормы, да іх выканання і караць за парушэнне гэтых нормаў. Другім адрозненнем прававых нормаў ад маральных і рэлігійных можна назваць іх агульнаабавязковы характар. Гэта азначае, што незалежна ад таго, хто ты па нацыянальнасці, веравызнанню, дзе працуеш ці жывеш, якое месца займаеш у грамадстве, падабаецца табе падпарадкоўвацца ці не – ты абавязаны выконваць прававыя нормы той дзяржавы, на тэрыторыі якой знаходзішся.

**Права – сістэма агульнаабавязковых правілаў паводзінаў, якія ўсталёўваюцца грамадзянамі непасрэдна (праз рэферэндумы) ці апасрэдавана (праз дзяржаўныя органы), і выкананне якіх забяспечваецца дзяржаўным прымусам.**

Больш наглядна асаблівасці маральных, рэлігійных і прававых нормаў пададзены ў наступнай табліцы:

| ВІДЫ НОРМАЎ | МАРАЛЬНЫЯ | РЭЛІГІЙНЫЯ | ПРАВАВЫЯ |
|---|---|---|---|
| *НА ЧЫМ БАЗУЮЦЦА* | Разуменне грамадствам дабра і зла | Запаветы, перададзеныя людзям Богам | Разуменне грамадствам справядлівасці |
| *ДЗЕ НОРМЫ ЎТРЫМЛІВАЮЦЦА* | • Свядомасць людзей;<br>• літаратура і мастацтва;<br>• абрады, традыцыі | • Рэлігійныя кнігі (Біблія, Каран, Рыгведы і г.д.); | • Канстытуцыя<br>• законы<br>• міжнародныя дагаворы |
| *ШТО НОРМЫ КАНТРАЛЮЮЦЬ* | Пераважна дзеянні | Дзеянні і думкі | Дзеянні |
| *ХТО ЎСТАЛЁЎВАЕ* | Грамадства | Царкоўныя арганізацыі | Дзяржаўныя органы |
| *ХТО ЗДЗЯЙСНЯЕ КАНТРОЛЬ* | • Грамадства;<br>• кожны з нас | • Бог;<br>• святары;<br>• Сам веруючы | • Пракуратура;<br>• міліцыя;<br>• суд і г.д. |


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

| | | | |
|---|---|---|---|
| *ПАКАРАННЕ ЦІ САНКЦЫЯ* | • Маральныя перажыванні (сумленне);<br>• грамадская думка | • Маральныя перажыванні;<br>• царкоўнае пакаянне;<br>• пекла | • Штрафы;<br>• турэмнае зняволенне;<br>• смяротнае пакаранне |

**Б.** Усе сацыяльныя нормы складаюць некаторае адзінства і моцна залежаць адны ад другіх. У сваёй сукупнасці сацыяльныя нормы ўсебакова ўздзейнічаюць на розныя сферы грамадскага жыцця. Гэта азначае, што адны нормы значна ўплываюць на іншыя, а там, дзе не прынята неабходнай, напрыклад, прававой нормы, часова могуць дзейнічаць іншыя сацыяльныя нормы. Так, яшчэ некалькі год таму, калі на Беларусі не існавала прававых нормаў, якія б усталўвалі адказнасць за кампутарнае хакерства, падобныя выпадкі рэгуляваліся толькі маральнымі нормамі.

На працягу гістарычнага развіцця не аднойчы адбываліся змены сярод сацыяльных нормаў, якія рэгулююць жыццё грамадства. Адміралі адныя віды нормаў, нараджаліся іншыя. Так на змену нормам першабытнага грамадства – звычаям, прыйшлі маральныя, рэлігійныя і прававыя. Змянялася не толькі форма і змест нормаў, але змяняліся месца і роля маральных, рэлігійных і прававых нормаў, сіла іх уплыву адна на адну.



*У сярэднявеччы значнае месца адводзілася рэлігійным нормам. Усе сацыяльныя нормы павінны былі грунтавацца і адпавядаць ім. У наш час такое месца адведзена прававым нормам. Значэнне і роля рэлігійных нормаў у еўрапейскіх дзяржавах змянілася істотна ў перыяд так званай Рэфармацыі XVI стагоддзя і буржуазных рэвалюцый канца XVIII-пачатку XIX ст.ст. У гэты час царкву і рэлігійныя нормы, якія ад яе сыходзілі, пачалі разглядаць ў якасці тормаза прагрэса. У выніку, прававыя нормы вызваліліся ад татальнага кантроля з боку царквы і сталі больш значнымі рэгулятарамі грамадскага жыцця, усталяваўшы свой уплыў на рэлігійныя нормы.*


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

Гэткае высокае становішча, прававых нормаў, аднак, не азначае, што яны прымаюцца дзяржавай без уліку традыцый, маральных поглядаў, палітычных ідэй ці эканамічных патрэбаў, якія пануюць у грамадстве. Прававыя нормы сапраўды знаходзяцца вышэй усіх іншых сацыяльных нормаў. Разам з тым, каб быць добрай нормай, якую выконваюць, гэтая норма павінна ўлічваць стаўленне іншых сацыяльных нормаў да той з'явы, якая ёй урэгулёўваецца. Напрыклад, законы супраць забойства адлюстроўваюць маральную норму, згодна з якой забойства іншага чалавека - гэта дрэнна. А ва ўсіх рэлігіях крадзеж лічыцца адным з цяжкіх грахоў.

Шчыльнае перапляценне маральных, рэлігійных, прававых, а таксама эканамічных, палітычных і іншых нормаў, ідэяў і каштоўнасцяў не азначае, што ўсе гэтыя нормы заўсёды аднолькава ставяцца да адных і тых жа з'яваў грамадскага жыцця. Далёка не ўсё, што маральна можа абавязкова быць законна. Так, напрыклад, немаральна здраджваць сябру, але згодна з нормамі крымінальнага права, калі вы даведаліся аб здзяйсненні злачынства, нават вашым сябрам, то вы абавязаныя, заявіць аб гэтым ў міліцыю, іначай самі здзейсніце злачынства і будзеце адказваць перад судом за непаведамленне аб здзейсненым злачынстве.

*Вось гісторыя, якая магла здарыцца ў даўнія часы.*

**"Літоўскія браты" з Пастаўшчыны.**

*У XVI стагоддзі, у часы Вялікага княства Літоўскага, на Беларусі пратэстанцтва стала папулярным рэлігійным рухам. Сярод беларускіх пратэстантаў выдзялялася група, якая называлася "Літоўскія браты". На іх думку, у аснове жыцця павінна ляжаць біблейская любоў і роўнасць усіх перад Богам. Дзяржаву і права Літоўскія браты лічылі шкоднымі таму, што яны пабудаваны на прымусе, гвалце і падпарадкаванні аднаго чалавека другому. У сувязі з гэтым, Літоўскія браты былі перакананы, што сапраўдны хрысціянін, не павінен падпарадкоўвацца дзяржаўным органам, мець залежных сялян і звяртацца ў суд для вырашэння канфліктаў.*

Іван Бохан і яго жонка – беларускія шляхцічы. Разам з іншымі сем'ямі блізкіх сяброў, якія таксама належылі да Літоўскіх братоў (усяго дванаццаць чалавек), яны вырашылі, што будуць жыць па прынцыпах і правілах, у якія вераць. Іван Бохан прапанаваў ім стварыць абшчыну, якая будзе ізалявана ад дзяржавы і астатняга грамадства, і жыць у гэтай абшчыне па правілах, прынятых самімі абшчыннікамі. Ён таксама прапанаваў ім вызваліць прыгонных

сялян, прадаць свае гаспадаркі, раздаць грошы бедным, а самім пасяліцца на яго землях, якія ён перадае ва ўласнасць абшчыны. Усе дванаццаць чалавек пагадзіліся і зрабілі ўсё так, як прапанаваў Іван Бохан. У абшчыне ўсё было агульным: і зямля, і дамы, і грошы, і прылады працы, а самі абшчыннікі былі роўныя адзін аднаму як браты і сёстры. Усе спрэчныя пытанні яны вырашалі самі на агульных сходах.

Пасля двух гадоў сумеснага жыцця, паміж абшчыннікамі, пачаліся канфлікты. На адным з агульных сходаў, за ўчынены жонкай Івана Бохана крадзеж, на падставе правілаў абшчыны, было прынята рашэнне аб выгнанні яе з абшчыны. З дадзеным рашэннем не пагадзіўся толькі Іван Бохан, бо ён хацеў, каб яго жонка і далей заставалася з ім. Астатнія абшчыннікі былі катэгарычна супраць і прынялі рашэнне аб выгнанні з абшчыны не толькі жонкі, але і самога Івана Бохана.

Пасля прыняцця агульным сходам рашэння аб выгнанні Івана Бохана і яго жонкі, Іван Бохан запатрабаваў ад астатніх абшчыннікаў ад'ехаць з яго маёнтка, паколькі гэта яго ўласнасць і ён не жадае, каб чужыя людзі знаходзіліся на яго зямлі.

У сваю чаргу абшчыннікі адмовіліся, і нагадалі, што Іван Бохан сам перадаў зямлю ва ўласнасць абшчыны і цяпер гэта не яго ўласнасць. Яны ж, таксама як Іван Бохан, не маюць нічога свайго і ім няма куды ісці і за што жыць. Акрамя гэтага Іван Бохан, як адзін з Літоўскіх братоў, не можа звяртацца ў суд, бо гэта будзе выступ супраць усіх прынцыпаў у якія яны вераць.

Іван Бохан падае іск у дзяржаўны суд з тым, каб пачалі справу аб незаконным захопе яго зямлі абшчыннікаў прымусова выселілі з яго земляў.

Дзякуючы таму, што прававыя нормы з'яўляюцца найбольш эфектыўнымі сярод іншых сацыяльных нормаў, часам людзі пачынаюць думаць, што пры дапамозе права можна вырашыць любое пытанне. *У Беларусі ў час Савецкага саюзу прававымі нормамі адмянілі прыватную ўласнасць і грошы. Гэтая норма была прынятая не гледзячы на тое, што большасць насельніцтва хацела і імкнулася захаваць сваю зямлю, а за працу на мануфактурах і заводах жадала атрымліваць грошы, а не карткі. Дадзеныя прававыя нормы супярэчылі і агульным эканамічным нормам – у выніку, грамадства пачало бяднець і дэградаваць. Дачакаўшы поўнай разрухі гаспадаркі, уладам, для таго каб выжыць, давялося адмяніць прававыя нормы якія пярэчылі падставовым эканамічным нормам. Улады зразумелі, што далёка не ўсе пытанні можна вырашыць пры дапамозе права.* З практыкі вядома, што існуе абмежаванне таго, што мы можам чакаць ад прававых нормаў.


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

Паколькі грамадства ўяўляе сабой складаны механізм, для яго ўрэгулявання неабходна існаванне розных відаў сацыяльных правілаў-нормаў. Сярод найбольш пашыраных сацыяльных правілаў-нормаў можна назваць маральныя, рэлігійныя, прававыя, палітычныя і эканамічныя. Усе сацыяльныя нормы разам складаюць сістэму правілаў, іначай кажучы, кожнае з правілаў дапамагае іншым ва ўрэгуляванні грамадскага жыцця. Усе правілы знаходзяцца ў залежнасці і падпарадкаванні ніжэйшых вышэйшым, аднаго правіла другому. На працягу гістарычнага шляха розныя з гэтых правілаў мелі большую ці меншую сілу і займалі ў іерархіі сацыяльных нормаў разныя месцы. Сёння вышэйшую сілу маюць прававыя нормы, таму што яны ўсталёўваюцца дзяржавай і з'яўляюцца абавязковымі для выканання. Аднак значнасць і роля, якую выконваюць прававыя нормы, не азначае, што яны адасоблены ад іншых сацыяльных нормаў. Іншыя сацыяльныя нормы значна ўплываюць на фармаванне прававых правілаў-нормаў.

**Хатняе заданне:**

1. Прачытайце выпадак і вызначце асабістае стаўленне да яго.
2. Адкажыце на наступныя пытанні:
   - ці трэба абшчыннікаў прыцягваць да адказнасці за незаконнае знаходжанне ў маёнтку Івана Бохана? Абгрунтуйце свой адказ;
   - запішыце ў сшытку па 3 аргументы на карысць Івана Бохана і ў абарону пазіцыі абшчыннікаў;
   - якія нормы ўрэгулёўвалі дадзеную сітуацыю? Якая сувязь тут паміж прававымі, маральнымі, рэлігійнымі нормамі і нормамі ўсталяванымі абшчыннікамі? Ці было маральна з пункту гледжання Івана Бохана падаваць у суд на абшчыннікаў? Ці было законным падаць у суд? Якія з нормаў знаходзяцца вышэй і чаму? Растлумачце сваю пазіцыю. Коратка занатуйце свае думкі ў сшытку.
3. Вызначце, якую ролю ў грамадстве граюць маральныя, рэлігійныя, прававыя нормы. Якія з іх маюць вышэйшую сілу? Абгрунтуйце свой адказ.


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

# ПРАВАВЫЯ І НЕПРАВАВЫЯ ЗАКОНЫ

***Права можна прадставіць як сукупнасць нормаў, якія ўсталеўваюцца дзяржавай. Нормы не існуюць самі па сабе, а запісваюцца ў пэўных дакументах – законах. Законы рэгулююць разнастайныя грамадскія адносіны - у сферы працаўладкавання, сямейна-шлюбных адносін, у сферы прадпрымальніцтва і г.д. Як узніклі законы, чым яны адрозніваюцца ад іншых дакументаў, якія ўтрымліваюць прававыя нормы, што такое прававыя і неправавыя законы – можна будзе даведацца з гэтай главы.***

**А.** Першыя прававыя нормы існавалі ў вуснай форме. Гэта былі звычаі. З'явіліся яны шмат стагоддзяў таму, у першабытным грамадстве. У кожнага племені былі свае звычаі, за іх невыкананне самым страшным пакараннем было выгнанне чалавека з племені – такія людзі звычайна гінулі ў дзікім лесе. Для старажытных людзей гэта былі неабходныя **законы выжавання** ў дзікай прыродзе. Але гэтыя нормы нідзе не запісваліся. Частка з іх забывалася і таму не выконвалася. Пазней людзі прыйшлі да высновы, што ўсе прававыя нормы лепей замацоўваць на паперы, камянях, дошчачках.

У 1901 годзе французская археалагічная экспедыцыя, якая раскопвала г. Сузы, на ўсход ад старажытнага Вавілона, знайшла базальтавы слуп, які цалкам быў пакрыты клінапіссю. Гэта ўнікальная знаходка была старажытнейшай (XIII стагоддзе да н.э.) крыніцай права - Зводам законаў цара Хамурапі. У адрозненне ад рымлян і славян, якія пісалі законы на драўляных дошчачках, старажытнаўсходнія народы выкарыстоўвалі камень, так як дрэва там было няшмат. "Слуп законаў" выстаўляўся на гарадской плошчы і павінен быў служыць правасуддзю і адначасова нагадваць: Ніхто не можа адмаўляцца ад выканання закона, спасылаючыся на няведанне права!

У сучасным праве існуе вельмі важны дакумент, у якім запісаны прававыя нормы. Гэты дакумент называюць **законам**.



©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

**Закон - гэта дакумент, які прымаецца ў асаблівым парадку заканадаўчым органам краіны і рэгулюе найбольш важныя пытанні дзяржаўнага і грамадскага жыцця. Закону павінны адпавядаць усе астатнія прававыя акты.**

Так, у Рэспубліцы Беларусь на сенняшні момант існуе каля 800 законаў. Самы галоўны закон у краіне – **Канстытуцыя**. Ад усіх іншых яна адрозніваецца тым, што ў ёй запісаны агульныя правілы, па якіх мы, грамадзяне краіны, паважаючыя сваю радзіму і іншых людзей, павінны жыць. У Канстытуцыі замацаваны не толькі нашыя абавязкі, але і нашыя правы, а таксама абавязкі дзяржавы перад сваімі грамадзянамі.

У іншых законах запісаны больш дакладныя нормы, якія раскрываюць і тлумачаць нормы Канстытуцыі. Напрыклад, Закон "Аб правах дзіцяці" замацоўвае самыя важныя і неад'емныя правы кожнага з дзяцей: права на жыцце, жылле, адукацыю, а таксама ў законе запісана, як кожны маленькі грамадзянін краіны можа абараніць свае правы. У законе "Аб абароне правоў спажыўцоў" замацоўваюцца правы і абавязкі прадаўцоў і пакупнікоў, а таксама тое, якім чынам мы, пакупнікі, можам абараніць свае права на набыцце якасных рэчаў.




Слова "заканадаўства" ахоплівае не толькі Канстытуцыю і законы, а таксама і шэраг іншых дакументаў, у якіх утрымліваюцца прававыя нормы. Гэтыя прававыя акты ў адрозненне ад закона прымаюцца не Парламентам, а міністэрствамі, камітэтамі, мясцовымі выканкамамі. Называюцца гэтыя дакументы – **падзаконныя прававыя акты**. Яны выдаюцца для больш падрабязнага тлумачэння законаў. Напрыклад, у законе "Аб падатках і зборах", які прыняты Парламентам, утрымліваецца палажэнне аб тым, што пры выкананні пэўных дзеянняў прадпрымальнікі маюць права на ільготы па падатках. А ў


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

інструкцыях, якія выдае Дзяржаўны падаткавы камітэт, ёсць дакладнае тлумачэнне, якія памеры ільгот могуць быць і што дакладна трэба зрабіць, каб іх атрымаць. Адной з прычын, чаму існуюць падзаконныя акты, з'яўляецца тое, што, калі б у законах утрымліваліся ўсе падрабязнасці, то яны б выглядалі, як збор сачыненняў вялікіх пісьменнікаў. Гэта значна ўскладняла б практычную працу з імі. Існуюць пэўныя правілы прыняцця падзаконных актаў. Самыя ж галоўныя з іх гэта:

**Па-першае,** падзаконныя акты павінны адпавядаць Канстытуцыі і закону, на ўдакладненне якога былі прынятыя.

**Па-другое,** падзаконныя акты павінны быць прынятыя органам, у чыю кампетэнцыю ўваходзіць вырашэнне падобных пытанняў.




**Б.** Законы прымаюцца, існуюць, па ім жыве грамадства. Але ўсё ж такі, у жыцці здараецца, што законы бываюць розныя – справядлівыя і несправядлівыя, гуманныя і антыгуманныя, сумленныя і несумленныя. У гэтых выпадках юрысты вядуць размову пра **прававыя і неправавыя законы**. Што маецца на ўвазе, калі гаворыцца, што закон з'яўляецца прававым?


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

У папярэдніх главах мы з вамі размаўлялі пра добрыя і дрэнныя правілы. Кожны закон таксама змяшчае правілы, па якіх жыве грамадства. І, адпаведна, кожны закон павінен адпавядаць тым рысам добрага правіла, якія мы ўжо разглядалі папярэдне. Аднак закон больш складаная з'ява, чым проста правіла, і таму, прававы закон, акрамя рысаў добрага правіла, павінен адпавядаць фармальным рысам прававога закона.

## Фармальныя рысы прававога закона

### 1. Прававы закон не павінен утрымліваць палажэнняў, якія ўціскаюць інтарэсы і правы значнай часткі насельніцтва краіны.

Канешне, закон не можа задавальняць абсалютна ўсіх людзей ў краіне. Ён не для гэтага ствараецца. Аднак, мы павінны памятаць, што законы выдаюцца, каб уладкаваць жыццё ў дзяржаве найлепшым чынам. Таму ўсе нарматыўныя акты, пачынаючы з Канстытуцыі і сканчаючы самым дробным пастанаўленнем, не павінны ўтрымліваць палажэнняў, якія б абаранялі інтарэсы нейкай нязначнай часткі насельніцтва, а для большасці стваралі б немагчымыя ўмовы існавання. Закон павінен стаяць на стражы абароны правоў і інтарэсаў грамадзян дзяржавы. Гэта асноўная мэта існавання законаў.

### 2. Прававы закон павінен прымацца заканадаўчым органам краіны.

Правам прымаць законы звычайна надзелены толькі адзін адмысловы орган краіны. Гэтае права замацоўваецца Вышэйшым законам – Канстытуцыяй. У сучаснасці заканадаўчым органам дзяржаў сусвету пераважна з'яўляецца Парламент. Дэпутаты ў Парламент абіраюцца народам і прадстаўляюць інтарэсы сваіх выбаршчыкаў. Таму, калі Закон прымаецца асобай ці органам, які не мае на гэта права, адбываецца парушэнне правоў кожнага грамадзяніна краіны на адстойванне сваіх інтарэсаў праз прадстаўніка ў Парламенце.


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

**3. Прававы закон павінен мець дакладна вызначаную працэдуру змены.**

Гэта правіла ўсталявана для таго, каб законы маглі гарантаваць стабільнасць для грамадства і для таго, каб пазбегнуць гвалтоўных і некантралюемых змен заканадаўства. Правам змяняць законы надзелены Парламент – той, хто іх прымае. Але гэта зусім не значыць, што закон набывае статус нязменнага, калі Парламент адмаўляецца яго змяніць. Існуе шэраг магчымасцей паўплываць на змену закона: можна ініцыяваць збор подпісаў звычайных грамадзян, якія хочуць унесці змены, альбо наогул адмяніць нейкі закон. І ў выпадку, калі гэта зроблена згодна з законам, заканадаўчы орган не мае права адмовіць у разглядзе прапановы.

**4. Прававы закон павінен быць апублікаваны.**

Для таго, каб грамадзяне выконвалі прававыя нормы, трэба, каб яны мелі магчымасць азнаёміцца з імі. Гэта адбываецца шляхам апублікавання закона ў газетах, зборніках законаў, распаўсюджвання праз усе сродкі камунікацыі (інтэрнэт, тэлебачанне і г.д.). Кожны закон павінен быць апублікаваны яшчэ і афіцыйна, каб на яго можна было спасылацца ў судзе і іншых установах.

Гісторыя прыводзіць шматлікія прыклады неправавых законаў, якія хаця і адпавядалі цалкам фармальным рысам прававога закона, аднак былі прынятыя з парушэннямі рысаў добрага правіла. Напрыклад, нейкі правіцель з італьянскага горада Локры па імені Зелеўк выдаў наступны закон: усякі, хто пад час хваробы вып'е без парады ўрача неразбаўленага віна, хай потым і паправіўшыся, павінен быць пакараны смерцю, таму што зрабіў так, як было не прадпісана. Памятаеце, што кожнае пакаранне павінна быць адпаведным парушэнню?

У законе ўсё павінна быць збалансавана. Толькі тады яго можна з упэўненасцю назваць прававым.

**В.** Прынядце ў краіне шэрагу неправавых законаў звычайна прыводзіць да палітычнай і грамадскай нестабільнасці. Большасць


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

насельніцтва краіны знаходзіцца ў прыгнечаным стане, не развіваецца эканоміка, адбываецца значны падзел грамадства на багатых і бедных, людзі не маюць магчымасці ўдзельнічаць у прыняцці дзяржаўных рашэнняў. Досыць змрочная карціна. Нам здаецца, што так на самой справе ў наш час быць не можа. Але закон – гэта моцная зброя, якая можа як абараніць, так і нашкодзіць. Ідэя прававой дзяржавы – дзяржавы, у якой усе законы прававыя, - мэта ўсіх сучасных краін. Сёння ўся міравая супольнасць уважліва сочыць за тым, каб у асобных дзяржавах не ствараліся такія ўмовы, пры якіх людзі гэтых краін былі б неабароненыя ад сваволу з боку дзяржавы.



Аднак, часцей за ўсё грамадзяне той краіны, у якой мае месца прыняцце неправавых законаў, не чакаюць знешняй дапамогі і ўмяшальніцтва. Калі прымаецца неправавы закон, ён абавязкова парушае нечыя правы. Такой сітуацыі можна супрацьдзейнічаць шляхам актыўнага стаўлення да падзеяў у дзяржаве. Грамадзяне павінны ведаць, што іх меркаванне, калі яно прадумана і публічна выказана, ніколі не застанецца без увагі.

Існуе шмат шляхоў уздзеяння на сітуацыю, якая ствараецца пры прыняцці неправавых законаў. Іх можна ўмоўна падзяліць на законныя і гвалтоўныя.

**Законыя дзеянні – комплекс дзеянняў, прадугледжаных і дазволеных законамі краіны і накіраваных на рэалізацыю правоў грамадзян.**

У першую чаргу давайце звернемся да **законных метадаў**. Гэта такія спосабы, як грамадскія абмеркаванні прынятых неправавых законаў на тэлебачанні, радыё, у газетах, на сходах, мітынгах, пры непасрэднай сустрэчы з законатворцамі. Грамадзяне таксама могуць выказваць сваю незадаволеннасць пікетамі, дэманстрацыямі, страйкамі. Падчас правядзення такіх мерапрыемстваў ва ўсіх жадаючых, нязгодных з прынятым законам, ёсць магчымасць выказаць сваё меркаванне і прапановы. Да таго ж, звычайна, вынікам


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

правядзення такіх масавых акцыяў становіцца перадача лістоў і зваротаў у дзяржаўныя органы з патрабаваннямі аб адмене ці змене закона.

Любое абмеркаване для дасягнення найлепшых вынікаў павінна праходзіць арганізавана. Вы, пэўна, чулі, што па тых ці іншых важных пытаннях праводзяцца **грамадскія слуханні** ці **дэбаты** з удзелам усіх зацікаўленных бакоў. Усё часцей можна ўбачыць і пачуць дэбатуючых грамадскіх дзеячоў у тэле- і радыёэфіры. Гэта адзін са спосабаў эфектыўнай арганізацыі абмеркавання. Да пачатку дэбатаў вызначаецца тэза – спрэчнае выказванне ці меркаванне, якое будуць абмяркоўваць удзельнікі. Да дэбатаў удзельнікі абавязкова рыхтуюцца загадзя для таго, каб аргументавана і эфектна выказаць сваё меркаванне, а таксама прыцягнуць на свой бок аднадумцаў.

Гісторыя таксама ведала і надаль запісвае на сваіх старонках выпадкі **гвалтоўных акцыяў** пратэсту. Рэвалюцыі, байкоты, пераварoты, путчы, захопы ўлады – усе гэтыя незаконныя шляхі ўздзеяння на тых, хто прымае законы, прыводзяць да розных вынікаў. Часам здаецца, што іншага спосабу проста не існуе. Напрыклад, згодна Канстытуцыі нейкай краіны грамадзяне не маюць права праводзіць публічныя акцыі, законы прымае адзін чалавек, а сродкі масавай інфармацыі падпарадкаваны дзяржаве і не даюць аб'ектыўнай інфармацыі аб тым, што адбываецца ў краіне. І тады ў ход ідуць зброя і гвалт. Вынікі такога спосабу змены сітуацыі, як вы пэўна ведаеце, бываюць розныя. Напрыклад, рэвалюцыя ў Англіі яшчэ ў 13 стагоддзі дала штуршок для развіцця парламентарызма. Усе добра ведаюць і прыклад Вялікай французскай рэвалюцыі 18 стагоддзя. Аднак, мы павінны заўсёды памятаць, што яшчэ ні адна такая акцыя не прайшла, каб не забраць нечага жыцця.



Няма адзінага адказу, які са спосабаў уздзеяння на дзяржаву пры існаванні неправавых законаў лепшы. Мы памятаем Гітлера, які прыйшоў да ўлады законным шляхам - праз выбары, і вайну, якая стала наступствам гэтай улады і патапіла ў крыві палову планеты. Таксама мы ведаем і пра барацьбу з аўтарытарнымі рэжымамі зусім нядаўна, якая ішла на Балканах.

Законы з'уляюцца самым галоўным з прававых дакументаў. Яны накіраваны на рэгуляванне самых важных і агульных грамадскіх адносін. Таму для дасягнення дабрабыту ў грамадстве яны павінны быць **прававымі**, гэта значыць, не парушаць правоў чалавека, абараняць сваіх грамадзян, выконвацца не шляхам прымусу, а ўсведамленнем грамадзянамі іх неабходнасці. Прававыя законы – гэта каштоўнасць сучаснай дзяржавы. Прынятцце неправавых законаў ставіць пад сумненне рэпутацыю той краіны, у якой яны прымаюцца. Калі грамадзян не задавальняе якасць закона, яны могуць паўплываць на яго змену. Які шлях яны абіраюць для гэтага залежыць толькі ад склаўшайся сітуацыі і сумлення людзей.

**Хатняе заданне:**

1. Падумайце і вызначыце сваё стаўленне да меркавання:

НЕПРАВАВЫЯ ЗАКОНЫ МОЖНА ЗМЯНЯЦЬ НЕЗАКОННЫМ ШЛЯХАМ

2. Запішыце у сшытак 4 аргуманты "за" і "супраць" гэтага выказвання.

3. Знайдзіце і запішыце ў сшытак прыклады, якія падмацоўвалі б кожны з вашых аргумантаў (гэта могуць быць цытаты, газетныя заметкі, прыклады гістрычных падзеяў, вынікі навуковых даследванняў).


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

# ЯК СТВАРАЮЦЦА ЗАКОНЫ

***Як вы памятаеце з папярэдніх главаў, права з'явілася не адразу. У гэтай главе размова пойдзе аб тым, як з'яўляюцца на свет законы: як выглядае працэс нараджэння закону, хто займаецца гэтай няпростай справай, а таксама пра тое, як мы можам паўдзельнічаць у стварэнні законаў.***

**А.** Адначасова са з'яўленнем прававых нормаў вызначылася і кола людзей, якія іх усталёўвалі. У мінулым законы прымаліся каралямі і князямі. Аднак неабходнасць калектыўнага вырашэння найбольш значных пытанняў людзі зразумелі таксама даўно. Амаль любое знешне самастойнае рашэнне ўладара прымалася пасля абмеркавання з бліжэйшым атачэннем. У далёкім мінулым на Беларусі важныя пытанні грамадскага жыцця прымаліся на агульным сходзе ўсіх дарослых свабодных мужчын - Вечы. Гэты сход збіраўся нерэгулярна, на ім прымаліся законы, замацоўваўся мір, абвяшчалася вайна, прымаліся рашэнні аб запрашэнні і выгнанні князя. У часы Вялікага княства Літоўскага адным з найвышэйшых органаў дзяржаўнай улады быў з'езд феадалаў – Сойм. З сярэдзіны 16 стагоддзя Сойм пачаў збірацца рэгулярна, меў шырокія паўнамоцтвы, і таму мы смела можам казаць, што з гэтага часу на Беларусі з'явіўся прадстаўнічы орган - **Парламент**. У свеце падобныя прадстаўнічыя органы, куды ўваходзілі прадстаўнікі ад розных слаёў грамадства, і якія маглі прымаць рашэнні, абавязковыя для ўсёй дзяржавы, з'яўляліся як раней, так і пазней за Беларусь. Але самае галоўнае, што аб'ядноўвала гэтыя ўстановы - гэта тое, што, па-першае, іх з'яўленне дазволіла абмежаваць уладу правіцеляў, а, па-другое, інтарэсы большай часткі насельніцтва такім ці іншым чынам былі прадстаўленыя праз іх абраннікаў. А таксама тое, што менавіта яны пачалі прымаць законы, па якіх жыла краіна.

*Самы першы Парламент у свеце з'явіўся яшчэ ў 1265 г. у Англіі.*


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

**Парламент (фр. parler - размаўляць)—вышэйшы прадстаўнічы, заканадаўчы орган, створаны часткова ці цалкам на выбарных пачатках.**

Развіццё парламентарызму, як падставы дэмакратыі, ішло сваім ходам. І сёння амаль кожная краіна мае прадстаўнічы орган, які займаецца распрацоўкай і прыняццем важных для дзяржавы актаў – законаў.

У кожнай краіне ён называецца па-рознаму. У Германіі - Бундэстаг, у ЗША – Кангрэс, у Кыргызстане - Жогорку Кэнэш, на Украіне - Вярхоўная Рада, у Расіі – Дума, у Польшчы – Сейм. На Беларусі Парламент называецца **Нацыянальным сходам**.

Паўнамоцтвы ў Парламента досыць разнастайныя. Але ж самыя асноўныя - гэта распрацоўка і прыняццё законаў і прадстаўніцтва інтарэсаў розных слаёў насельніцтва. Глава 4 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь цалкам прысвечана пытанням працы Парламента.

Распарадак працы Парламента вельмі своеасаблівы: працуе ён сесіямі – восенская, якая доўжыцца два з паловай месяцы, і вясенняя, працяглаcць якой тры месяцы. Перапынак паміж імі называецца парламентскімі канікуламі. Людзі, якія абіраюцца для працы ў Парламенце, называюцца **дэпутатамі**.

У выніку выбараў дэпутатамі Парламента становяцца розныя асобы, прафесіяналы ў розных галінах чалавечай дзейнасці. Пад час працы дэпутаты ўтвараюць нібыта групы па інтарэсах – **фракцыі**.

**Фракцыя (лат. fractio - разламываннне) - як правіла, арганізаваная група сябраў палітычнай партыі, саюза партый, грамадскіх аб'яднанняў, якая праводзіць іх палітыку ў Парламенце ці органах мясцовага самакіравання.**

Фракцыйная праца больш распаўсюджаная за мяжой, дзе ў выбарах арганізавана ўдзельнічаюць палітычныя партыі, саюзы, грамадскія аб'яднанні. Калі прадстаўнікі гэтых розных груп


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

трапляюць у Парламент, яны аб'ядноўваюцца для больш эфектыўнай абароны інтарэсаў таго слоя насельніцтва, які іх абраў, і які яны прадстаўляюць у Парламенце. Галоўнае ў такой працы - гэта знайсці кампраміс паміж інтарэсамі. Хаця, вядома, не абыходзіцца і без сутыкнення меркаванняў. Але ж асноўнае, што аб'ядноўвае ўсіх гэтых людзей, гэта тое, што іх прафесія – прымаць законы, па якіх будзе потым жыць цэлая краіна.

Як жа гэта адбываецца?

**Б**. Прыняцце законаў не такая ўжо заблытаная і складаная справа, як можа здацца на першы погляд. Проста вельмі адказная. Сама працэдура, якая называецца **заканадаўчым працэсам**, дакладна апісана ў Канстытуцыі.

| |
|---|
| **Заканадаўчы працэс - парадак дзейнасці заканадаўчага органа па стварэнню законаў.** |

Любы закон пачынаецца з праекта. Распрацоўкай праекта закона звычайна займаюцца прафесіяналы - юрысты.

Праект закона, да таго як стаць сапраўдным законам, па якому будзе жыць грамадства, праходзіць ясна акрэсленыя стадыі, ці крокі:

**1. Заканадаўчая ініцыятыва (унясенне законапраекта)**

**2. Абмеркаванне законапраекта**

**3. Прыняццё закона**

**4. Апублікаванне закона і ўступленне яго ў дзеянне**

Працэдура прыняцця закона вельмі падобна да працэса прыняцця любых іншых рашэнняў:


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

1. *Спачатку ў некага ўзнікае ідэя. Да прыкладу – аб правядзенні агульнашкольнага Дня вучнёўскага самакіравання. Што неабходна, каб яна стала рэчаіснасцю? Для таго, каб звярнуцца да дырэкцыі школы з гэтай прапановай недастаткова толькі ідэі. Трэба падрабязна распрацаваць розныя арганізацыйныя пытанні, каб ідэя прыняла выгляд дакладнай сур'ёзнай прапановы. Потым ініцыятыўная група, хучэй за ўсё, займецца пошукам аднадумцаў ці, нават, зборам подпісаў пад заявай да дырэктара. Гэта робіцца звычайна для дэманстрацыі важнасці дадзенай прапановы для шырокага кола асобаў.*

Таксама і ў выпадку з законам. Першае, што адбываецца на шляху прыняцця закона – з'яўляецца **законапраект**. Права ўнясення законапректа на разгляд у Парламент называецца **правам заканадаўчай ініцыятывы**. Канстытуцыя дакладна вызначае, што з прапановай законапраекта могуць звярнуцца:

- **дэпутат Парламенту**
- **Прэзідэнт**
- **Урад**
- а таксама самі **грамадзяне** краіны, якія валодаюць **выбарчым правам** (значыцца маюць права выбіраць і быць абранымі на выбарныя пасады) у колькасці не менш як **50 тысяч** чалавек. Гэта не значыць, што ўсе 50 тысяч павінны сабрацца і пайсці з праектам закона ў Парламент. Проста ініцыятарамі павінна быць сабрана неабходная колькасць подпісаў у падцверджанне патрэбнасці закона.

Законапраект, які падаецца для разгляду ў Парламент любой асобай ці групай асобаў, якія маюць на гэта права, павінен быць абавязкова разгледжаны на паседжанні Парламента.

2. Гэта і адбываецца на наступным этапе. *Вернемся да прапановы правядзення Дня самакіравання ў школе. Пасля яе распрацоўкі і ўдакладнення прапанова выносіцца на суд грамадскасці. На Сход школы, напрыклад. Ініцыятар распавядае пра сутнасць ідэі. Пачынаецца абмеркаванне. На кожную ідэю ў розных*


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

*людзей заўсёды ёсць свае меркаванні. Нехта не згодзен, некаму ўсё роўна, а ў некага, магчыма, з'явіліся новыя ўдакладненні.*

Менавіта ў гэтым і заключаецца працэс абмеркавання законапраекту. На паседжанні Парламента, якое прысвечана разгляду праекта закона, той, хто выступіў з заканадаўчай ініцыяітывай, робіць даклад па сутнасці будучага закона. Таксама з дакладам-заключэннем па праекту выступае адпаведная камісія ці камітэт Парламента. Напрыклад, калі законапраект тычыцца экалагічных пытанняў, то "дыягназ" аб яго жыццяздольнасці ставіць парламентская камісія, якая займаецца праблемамі аховы навакольнага асяроддзя. У выніку абмеркавання на паседжанні Парламента праект можа быць:



1) адобраны і ў яго могуць быць унесены неабходныя змены і дапаўненні,

2) прызнаны неактуальным і непатрэбным,

3) адпраўлены на дапрацоўку.

На этапе абмеркавання законапраекта важную ролю можа адыгрываць грамадства. Законапраекты перад тым, як прымацца, звычайна друкуюцца ў газетах, рассылаюцца ва ўстановы, якія займаюцца той дзейнасцю, якая будзе рэгулявацца гэтым законам у выпадку яго прыняцця (напрыклад, Крымінальны кодэкс перад прыняццем рассылаецца ў міліцыю, пракуратуру і суды), і такім чынам выносяцца на **грамадскае абмеркаванне**. Арганізацыі, установы і грамадзяне (!) могуць выказаць сваё меркаванне па праекту будучага закона, прапанаваць змяненні і дапаўненні, якія, як яны лічаць, палепшаць закон. Свае прапановы яны могуць дасылаць свайму дэпутату, абранаму ад іх акругі ў Парламент, на адрас Парламента, з адзнакай на капэрце, у якую камісію накіроўваецца прапанова, ці адзнакай, па якому законапраекту падаюцца прапановы. Па законапраектах таксама могуць быць арганізаваны **грамадскія слуханні** - сходы грамадскасці, на якіх праходзіць публічнае абмеркаванне будучага закона і прымаюцца прапановы і

дапаўненні. Гэтыя прапановы потым накіроўваюцца ў Парламент ад імя гэтай групы. На Беларусі такая практыка пакуль што не вельмі распаўсюджаная, але прыклады ўжо ёсць: узімку 2001 года на грамадскае абмеркаванне выносіўся закон "Аб адукацыі", і законатворцы прынялі да ўвагі некаторыя прапановы, якія былі зроблены моладзевымі арганізацыямі, -- у праект былі ўнесеныя адпаведныя змены.

3. *І вось усе дапаўненні, заўвагі ўлічаныя, унесены патрэбныя змены ў прапанову аб правядзенні Дня школьнага самакіравання. Што засталося зрабіць для таго, каб прапанова стала рашэннем? Прычым рашэннем большасці школьнай грамадскасці, а не групы ініцыятараў? Зразумела, праводзіцца галасаванне, вынікі якога і адлюстроўваюць наколькі дадзенае рашэнне патрэбна вашаму школьнаму грамадству.*

Праект закона становіцца законам таксама шляхам галасавання. Прынятым лічыцца праект, за які прагаласавала больш за палову дэпутатаў (50% + 1 голас – гэта ўжо больш за палову) ад поўнага складу Парламента.



*Што робіцца пасля агульнага прыняцця рашэння аб правядзенні Дня вучнёўскага самакіравання? Разумна было б узгадніць яго з дырэктарам, праўда? Таму заява ад Сходу школы трапляе на подпіс дырэктару.*

Прыняты закон накіроўваецца на подпіс Прэзідэнту. Для гэтага Канстытуцыяй вызначаецца дзесяцідзённы тэрмін. Калі Прэзідэнт згодны з тэкстам закона, ён, зразумела, падпісвае яго. Дарэчы, закон, які Прэзідэнт не вярнуў на працягу двух тыдняў для перагляду ў Парламент, аўтаматычна лічыцца падпісаным. Калі



©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

Прэзідэнт не згодны з прыняццем закона, ён адпраўляе яго на дапрацоўку ў Парламент.

4. *Усё патрэбнае, каб добрая ідэя аб правядзенні Дня самакіравання стала рэчаіснасцю, было паспяхова зроблена. Усе адабрэнні былі атрыманы. І што далей? А далей усё проста. Трэба вызначыць тэрмін для правядзення гэтага важнага мерапрыемства і абвясціць пра гэта школьнай грамадскасці.*

У выпадку з прыняццем закона ўсё адбываецца наступным чынам. Аб тым, што з'явіўся новы закон, які трэба выконваць, павінны даведацца людзі. Заканадаўствам вызначаецца, што адзінымі выданнямі, у якіх ажыццяўляецца **афіцыйная публікацыя** законаў і іншых нарматыўных актаў, з'яўляюцца Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь і газеты "Звязда", "Народная газета" і "Рэспубліка". Гэтыя выданні абавязкова публікуюць усе новапрынятыя законы. Усе астатнія выданні - па свайму ўласнаму жаданню, і публікацыя ў іх не з'яўляецца афіцыйнай. Спасылацца ў судах, іншых афіцыйных установах і ў важных паперах можна толькі на афіцыйныя выданні.

Што тычыцца тэрміну пачатку дзеяння закона (уступлення яго ў сілу), то ён вызначаны як **10 дзён** з моманту яго афіцыйнага апублікавання. Гэта агульнае правіла, але могуць быць выпадкі, калі дакладная дата ўступлення закону ў дзеянне вызначана ў самім законе. Тэрмін гэты вызначаецца з меркавання мэтазгоднасці і рэальных абставін.




---

Вось так і з'яўляюцца на свет законы. Спецыяльна створаны для гэтага орган - **Парламент** - займаецца распрацоўкай і прыняццем заканадаўчых актаў, па якіх потым жывем мы з вамі. Наколькі тыя законы, якія прымаюцца ў краіне, будуць добрымі і будуць аб'ектыўна ўлічваць інтарэсы ўсяго грамадства, залежыць не толькі ад прафесійнасці

парламентарыяў. Само грамадства можа актыўна дапамагаць законатворцам у іх справе, выкарыстоўваючы свае правы, такія, як права заканадаўчай ініцыятывы, магчымасць удзелу у абмеркаванні законапраектаў. Таксама мы павінны памятаць, што абіраючы дэпутата, мы таксама загадзя вырашаем, які чалавек будзе прадстаўляць нашыя інтарэсы ў Парламенце падчас прыняцця законаў і адпаведна, якія законы будуць прымацца. Таму ўдзел у выбарах – гэта таксама ўдзел у стварэнні законаў.

---

**Хатняе заданне:**

Прачытайце прапанаваны законапраект.

| |
|---|
| НЕПАЎНАЛЕТНІЯ АСОБЫ НЕ МАЮЦЬ ПРАВА ЗНАХОДЗІЦЦА НА ВУЛІЦЫ ПАСЛЯ **21.30**. ЗА ПАРУШЭННЕ З БАЦЬКОЎ БЯРЭЦЦА ШТРАФ У ПАМЕРЫ **5** МІНІМАЛЬНЫХ ЗАРОБКАЎ. |

Адказы на наступныя пытанні адзначце ў сшытку:

1. Вызначце сваё стаўленне да прапанаванага законапраекта.
2. Хто можа быць зацікаўлены ў прыняцці такога закона?
3. Чые інтарэсы ён закранае?
4. Якія мэты ставяць перад сабой законатворцы ў дадзеным выпадку?
5. Як бы вы змянілі законапраект, каб ён, на ваш погляд, задавальняў большасць з зацікаўленных асоб.
6. Перамалюйце схему заканадаўчага працэса ў сшытак і адзначце, на якіх этапах прыняцця закона грамадзяне могуць уплываць на гэты працэс.


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

# ЯК ВЫКОНВАЮЦЦА ЗАКОНЫ. АБСКАРДЖАННЕ НЕЗАКОННЫХ ДЗЕЯННЯЎ ЧЫНОЎНІКАЎ

***Цэлы стос законаў прыняты. Розныя міністэрствы, ведамствы і іншыя ўпаўнаважаныя органы прынялі таксама шэраг дакумантаў для таго, каб удыхнуць жыццё ў фармальныя палажэнні закона. А далей? Далей закон пачынае дзейнічаць і дзейнічае ён праз выкананне яго асобнымі людзьмі. Нагляд за дакладным выкананнем законаў ажыццяўляюць адмысловыя кампетэнтныя органы дзяржаўнай улады – абласныя і гарадскія выканаўчыя камітэты, кіраўніцтва прадпрыемстваў і ўстаноў, міліцыя, пракуратура. Пра тое, хто адказвае за выкананне законаў, а таксама як абскардзіць незаконныя дзеянні чыноўнікаў, звязаныя з выкананнем законаў, пойдзе размова ў гэтай главе.***

**А.** «Адмысловыя кампетэнтныя органы дзяржаўнай улады» гучыць досыць абстрактна. Але ж заканадаўства вызначае, якія ўстановы адносяцца да дзяржаўных. Напрыклад, гэта падаткавая інспекцыя, раённыя, гарадскія і абласныя выканкамы, міністэрствы, камітэты і іншыя. У кожнай канкрэтнай установе працуюць канкрэтныя людзі. Гэтых людзей звычайна называюць **службовымі асобамі** ці папросту - чыноўнікамі. Праца чыноўнікаў гэтых устаноў звязана з тым, што яны на месцах сочаць за дакладным выкананнем законаў. Таму ім нададзены паўнамоцтвы прымаць рашэнні ад імя дзяржаўных органаў для таго, каб прымусіць некага дзейнічаць так, як прадпісана законам (напрыклад, гарвыканкам можа выдаць пастанову, згодна з якой будынкі ў гістарычным цэнтры горада не могуць прадавацца ў прыватную ўласнасць і перабудоўвацца. Гэта будзе забяспечваць выкананне закона аб захаванні гістарычнай спадчыны краіны). Ці, наадварот, «даць зялёнае святло» чалавеку, каб ён мог скарыстацца правамі, якія нададзены яму законамі (напрыклад, рашэнні аб рэгістрацыі прыватных прадпрымальнікаў прымае аблвыканкам). Права прымаць такія рашэнні для службовых асобаў таксама ўсталявана законам. Значыцца, чыноўнікі на сваіх пасадах, таксама як і мы, выконваюць законы. Розніца толькі ў тым, што ад іх рашэнняў нярэдка залежаць лёсы іншых асобаў...


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

Старажытныя кітайцы казалі, што сутнасць чалавека праяўляецца, калі ён атрымоўвае ўладу над іншымі. Так склалася з даўніх часоў, што падсвядома людзі не заўсёды правільна ставяцца да чыноўнікаў. Як вы адчуваеце сябе, калі вас выклікаюць да дырэктара? Нават, калі ведаеце, што нічога дрэннага не зрабілі, напэўна, нейк беспакойна. Такое стаўленне да службовых асобаў, як да ўсемагутных «уладароў лёсаў чалавечых» спрыяе таму, што сапраўды чыноўнік пачынае сябе адчуваць менавіта так. А на самой справе гэтыя людзі прыняты на працу і атрымліваюць заробак з грошай, якія вашыя бацькі плоцяць у якасці падаткаў. І іх прамы абавязак – дзейнічаць у інтарэсах грамадзян, якія звяртаюцца да іх. Гэта не жаданне чыноўніка аказываць паслугу ці не, гэта яго абавязак, таму што менавіта людзі нанялі яго на працу. Сваімі дзеяннямі службовыя асобы павінны дапамагаць грамадзянам выкарыстоўваць свае правы, нададзеныя ім законам.



З гэтага вынікае простая рэч: калі нам адмаўляюць у здзяйсненні пэўных дзеянняў, альбо службовая асоба сваім рашэннем парушае нашыя правы, мы маем права скардзіцца, патрабаваць прыцягнення яе да адказанасці і выканання патрэбных нам дзеянняў. Прычым скардзіцца могуць не толькі вашыя бацькі ці ўвогуле дарослыя асобы, але і непаўнагадовыя. А гэта значыць, што і вы таксама, калі закранаюцца вашыя інтарэсы, можаце звяртацца з заявамі і скаргамі, якія тычацца дзеянняў чыноўніка. Для гэтага існуе пэўная працэдура. Юрысты называюць яе **абскарджаннем** дзеянняў. Гэтае права замацавана ў Канстытуцыі, а працэдура больш дакладна распісана ў Законе «Аб зваротах грамадзян» ад 6.06.1996.

Згодна закона грамадзяне маюць права звяртацца да службовых асобаў з заявамі і скаргамі.


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

**Заявы** - звароты грамадзян, у якіх утрымліваюцца патрабаванні аб рэалізацыі іх правоў і законных інтарэсаў.

*Прыклад: Прадпрымальнік - мнагадзетны адзінокі бацька мае права на атрыманне ільгот па выплаце падаткаў на даходы ад прадпрымальніцкай дзейнасці. Але для таго, каб атрымаць гэтыя ільготы, ён павінен напісаць заяву ў падаткавую інспекцыю з просьбай аб прадастаўленні яму ільгот па выплаце падаткаў, з указаннем падставы.*

**Скаргі** - звароты грамадзян, якія ўтрымліваюць патрабаванні аб абароне іх правоў і законных інтарэсаў, якія былі парушаныя дзеяннямі службовых асобаў адпаведных органаў, устаноў, арганізацый і прадпрыемстваў.

*Прыклад: планавае размеркаванне жылля ў Гарвыканкамах ажыццяўляецца згодна дакладна вызначанай чаргі. Некалькі чалавек, якія стаялі на чарзе на атрыманне жылля, заўважылі, што размеркаванне адбываецца такім чынам, што тыя людзі, якія стаялі апошнімі ў чарзе, ужо атрымалі жыллё. Тыя жыхары, якія гэта заўважылі, напісалі скаргу на імя старшыні Гарвыканкама на дзеянні загадчыка жыллёвага аддзела гарвыканкама, які ў абыход чаргі на планавае атрыманне жылля, выдзяляе кватэры сваім знаёмым.*

**Б**. Для зваротаў у розныя інстанцыі існуюць свае правілы. Разгледзім, якім жа чынам падаюцца і разглядаюцца заявы і скаргі.

1. **Куды.** Існуюць вызначаныя ўстановы для разгляду зваротаў грамадзян. Скаргу на незаконныя дзеянні службовай асобы і заяву з патрабаваннем здзяйснення патрэбных дзеянняў можна накіраваць:

- вышэйпастаўленай службовай асобе (гэта значыць начальніку таго чыноўніка, які не задаволіў вашу просьбу, ці парушыў нейкае права);


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

- у пракуратуру (туды можна звяртацца, амаль ва ўсіх выпадках, калі вашыя правы парушаюцца, а таксама, калі вам стала вядома, пра незаконныя дзеянні чыноўніка.);
- у міліцыю (калі чыноўнікам, на ваш погляд, здзейснена злачынства);
- у суд (калі дзеяннямі чыноўніка, які парушыў вашыя правы, вам нанесена шкода. Зварот у суд называецца іскавой заявай, ці іскам).

Звароты павінны быць адрасаваны службовым асобам органаў ці ўстаноў, у кампетэнцыю якіх уваходзіць рашэнне пытанняў, якіх тычыцца зварот. Не страшна, калі зварот трапіў не па адрасу. У гэтым выпадку службовая асоба, якая не мае права разглядаць пастаўленыя ў звароце пытанні, павінна не пазней, чым праз пяць дзён накіраваць яго ў адпаведную інстанцыю і паведаміць аб гэтым чалавеку, які звярнуўся з заявай ці скаргай. Напрыклад, калі ў суд трапляе скарга на чыноўніка, які за хуткае вырашэнне вашай справы патрабаваў хабар, для праверкі фактаў, пададзеных у заяве, і, магчыма, узбуджэння крымінальнай справы, суд накіроўвае гэты зварот у міліцыю. А вам дасылаецца паведамленне аб перадачы матэрыялаў у міліцыю з указаннем асобы, адказнай за правядзенне праверкі.




**2. Форма.** У законе «Аб зваротах грамадзян» пазначаныя патрабаванні да формы заяваў і скаргаў. На працягу жыцця чалавеку прыходзіцца складаць нямала розных афіцыйных дакумантаў. Таму веданне правілаў сладання гэтых папер нашмат спрашчае працэс выкарыстання сваіх правоў.


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

Ніжэй пададзена «шпаргалка», як павінен выглядаць любы зварот і якія звесткі ён павінен ўтрымліваць.

Каму (пасада, назва
ўстановы, прозвішча,
імя, імя па бацьку)

(ад) каго (прозвішча, імя,
імя па бацьку, адрас, тэлефон)

***заява (скарга).***

У залежнасці ад сутнасці можа змяшчаць:

1. **Уводная частка**: па якой прычыне звяртаецца асоба, ці сутнасць справы, вы павінны дакладна выкласці, што здарылася.
2. **Абгрунтаванне**: можа змяшчаць спасылкі на прававыя нормы або нейкія іншыя аргументы, якія тычацца прычыны звароту. Факты, чаму вы лічыце, што вашыя правы парушаны
3. **Заключная частка**: чакаемыя вынікі ад заявы (скаргі), пытанні да адрасата, просьба паведаміць аб рашэнні, якое было прынята па справе.

**Дата** **Подпіс**

Да заявы можа быць прыкладзены дадатак, неабходны для падцвярджэння нейкіх фактаў, якія маюць месца ў заяве (копія квітка з крамы, у якой аблічылі, копія афіцыйнай адмовы нейкага органа і г.д.) або, калі неабходны, квіток аб аплаце пошліны. (Прыкладаць лепш копіі, каб у выпадку, калі прыкладзеную копію дакуманта згубяць, вы змаглі б спаслацца на арыгінал. Таксама карысна ўказваць колькасць старонак дадатка.).

**Дадатак.**
1. Квіток з крамы (копія) 1 стар.
2. і г.д.

Як мы бачым, пісьмовы зварот абавязкава павінен утрымліваць подпіс грамадзяніна з указаннем прозвішча, імя і імя па бацьку, дадзеныя аб месцы жыхарства ці працы (вучобы), таксама павінна быць выкладзена сутнасць справы, праблемы. Звароты, якія не ўтрымліваюць гэтых звестак, лічацца ананімнымі і не разглядаюцца. *Выключэнне складаюць толькі «ананімкі», якія*


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

*ўтрымліваюць звесткі аб злачынствах, яны абавязкова правяраюцца на даставернасць.*

3. **Рэгістрацыя.** Зварот павінен быць зарэгістраваны. Гэта патрэбна для таго, каб пазней была магчымасць прыцягнуць да адказнасці чыноўніка, які можа праігнараваць яго. Рэгіструюць звароты звычайна ў канцэлярыі ўстановы, у якую яны трапляюць, ці ў сакратара прыёмнай кіраўніка адпаведнай установы. Калі вы хочаце быць упэўненыя у тым, што ваш зварот зарэгістраваны, вы можаце паступіць наступным чынам:

- аднесці зварот асабіста ў канцэлярыю ўстановы. Пажадана, каб у вас было два экзэмпляра звароту - першы пакінеце ў канцэлярыі, другі забярэце з сабой, пасля таго, як там яго зарэгіструюць у спецыяльным журнале, пранумаруюць і паставяць штамп з нумарам і датай;
- адаслаць па пошце (лепей з уведамленнем аб атрыманні, каб у вас застаўся квіток аб дастаўцы. Тады квіток будзе доказам аб тым, што вы даслалі зварот).

Рэгістрацыя патрэбна таксама і для кантралявання тэрміну вырашэння пытанняў, пастаўленных у звароце. Усе зарэгістраваныя звароты павінны быць абавязкова разгледжаны, і аб выніках разгляду павінен быць пастаўлены ў вядомасць заяўца. Рашэнне па заяве ці адмова ў яе разглядзе павінны быць пісьмова матываваны. Заўсёды патрабуйце пісьмовага, аргументаванага адказу, каб пазней, пры неабходнасці, вы маглі спасылацца на яго.

4. **Разгляд.** Законам усталяваны дакладныя тэрміны для вынясення рашэнняў па зваротах грамадзян. Любы зварот павінен быць разгледжаны, і па ім павінна быць прынята рашэнне не пазней аднаго месяца са дня яго паступлення (рэгістрацыі). А калі не патрабуецца нейкая асаблівая праверка, то на працягу 15 дзён. Праверка можа праводзіцца па розных пытаннях. Напрыклад, патрабуюцца дадатковыя тлумачэнні ад іншых асобаў, ці неабходна дадатковая праверка нейкіх дакументаў. Аб выніках разгляду вашага звароту вам павінна быть абавязкова паведамлена, часцей за ўсё пісьмова. Калі ваш зварот не разгледжаны ў гэты вызначаны тэрмін


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

- гэта парушэнне, і, калі вы ўсё да гэтага зрабілі правільна, то можаце смела скардзіцца (глядзі п. 1) на чыноўніка, які не звярнуў на ваш зварот належнай увагі.

Таксама памятайце, калі вам не даслалі адказ на ваш зварот - гэта парушэнне закона, і вы маеце права патрабаваць тлумачэнняў і скардіцца на невыкананне закона чыноўнікам, адказным за разгляд і вырашэнне вашай справы.



Хацелася б таксама адзначыць, што шкода, нанесеная незаконнымі дзеяннямі службовых асобаў, як матэрыяльная так і маральная, можа быць кампенсавана ў судовым парадку праз зварот у суд з іскавой заявай. Матэрыяльная шкода кампенсуецца тады, калі вы ў выніку незаконных дзеянняў чыноўнікаў панеслі страты (напрыклад, вы арганізавалі нейкае мерапрыемства, зрабілі рэкламу, запрасілі гасцей, спонсараў, замовілі гатэль, купілі кветкі, каву, гарбату і г.д., карацей, уклалі ў справу вызначаную суму грошай. А спадар Чыноўнік у апошні дзень адказаў на вашую заяву аб дазволе на правядзенне гэтага мерапрыемства нематываваным адказам).

**Хатняе заданне:**

Прачытайце выпадак і адкажыце на пытанні пасля яго:

Прадстаўнікі мясцовай экалагічнай арганізацыі «Экасвет» вырашылі правесці дабрачынны бардаўскі канцэрт для таго, каб звярнуць увагу жыхароў горада і мясцовых уладаў на праблему знішчэння пластыкавага смецця, колькасць якога павялічылася ў апошнія гады, што цягне за сабой забруджванне горада і яго ваколіц неарганічнымі незнішчальнымі адходамі. Згодна з Законам «Аб сходах, мітынгах, вулічных шэсцях, дэманстрацыях і пікетаванні» для правядзення любога масавага мерапрыемства неабходна атрымаць дазвол ад мясцовых органаў улады. Для атрымання дазвола арганізатары за 15 дзён да правядзення канцэрта звярнуліся да старшыні Гарвыканкама з заявай аб дазволе на яго правядзенне,


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

як таго патрабуе закон. Адказ на такую заяву даецца не пазней за пяць дзён да правядзення мерапрыемства. Так і адбылося. Адказ быў дасланы за пяць дзён да правядзення запланаванага канцэрта: правядзенне канцэрта забаранілі, матывуючы адмову тым, што па заканадаўству патрабуецца ліцэнзія на дабрачынную дзейнасць. Як высветлілася на прыёме ў юрыста ліцэнзія, на самой справе ў дадзеным выпадку была непатрэбна.

1. Што вы зрабілі б на месцы арганізатараў канцэрта ў такой сітуацыі, для таго, каб мерапрыемства адбылося?
2. Звароты ў якім выглядзе і куды можна напісаць у гэтай сітуацыі? Адзначце адказы ў сшытку.
3. Прадумайце аргументы, якія можна было б выкарыстаць у гэтым пісьмовым звароце і занатуйце іх у сшытку.


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

# ЯК МОЖНА ПАЎПЛЫВАЦЬ НА ЗМЕНУ ЗАКОНА

***У дэмакратычнай дзяржаве законы не могуць быць ані нязменнымі, ані ўсталяванымі зверху, гэта значыць, грамадзяне маюць права ўплываць на змену законаў альбо прыняццё новых. Законы можна і трэба змяняць, калі яны неправавыя або, калі яны састарэлі і перасталі эфектыўна рэгуляваць грамадскія адносіны. Гэтая глава будзе прысвечана спосабам (альбо стратэгіі, гэта значыць, мэтанакіраваным дзеянням) уплыву на змену неправавых ці састарэлых законаў і заканадаўчых актаў, а менавіта - праз ціск грамадзянскай супольнасці (грамадзянскія акцыі і ўдзел у працы грамадскіх аб'яднанняў ці палітычных партыяў), а таксама праз законны ўплыў на рашэнні, якія прымаюць дэпутаты і чыноўнікі.***

**А.** Прапануем вам прааналізаваць мажлівасці змены закону на Беларусі праз прыклад закону "Аб вайсковай службе" ад 5.11.1992 г. Гэты закон закранае і вашыя інтарэсы, бо калі ты - хлопец, перад табой можа хутка паўстаць пытанне пра праходжанне вайсковай службы, а калі ты - дзяўчына, у войска могуць забраць твайго хлопца ці брата. Мы спынімся на адным з аспектаў дадзенага закона - праблеме ўвядзення альтэрнатыўнай службы.



**Альтэрнатыўная (ад лац. alter – аздін з двух) служба** – магчымасць праходжання вайсковай службы, выконваючы сацыяльна важную працу, без зброі ў руках. Гэты від службы – пытанне неадназначнае, якое выклікае шмат спрэчак у грамадстве. Тым не менш, яна існуе ў шмат якіх Еўрапейскіх краінах, у тым ліку і ў нашых суседзяў (Літва, Латвія, Украіна). Сутнасць альтэрнатыўнай службы ў тым, што па дасягненні 18 год кожны малады чалавек павінен адслужыць у войску. Аднак, калі па сваіх асабістых перакананнях (напрыклад, рэлігійных – калі веравызнанне не дазваляе браць у рукі зброю, ці грамадскіх – калі гэта не дазваляе сумленне маладога чалавека) ён не жадае служыць, неабходна напісаць заяву ў адпаведны дзяржаўны орган з просьбай аб праходжанні альтэрнатыўнай службы. Гэты від службы цягнецца не год, як звычайна, а болей – 3-4 гады. Маладыя людзі таксама прымаюць прысягу на


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

вернасць радзіме, але бяз зброі ў руках, і замест вайсковай службы яны наглядаюць за хворымі ў шпіталі, працуюць з цяжкімі дзецьмі, інвалідамі, састарэлымі і г.д.

Артыкул 57 Канстытуцыі РБ датычны абавязку абароны айчыны грамадзянамі, кажа аб праве (у выпадку нежадання служыць у войску) праходзіць альтэрнатыўную службу і дае спасылку на адпаведны закон. Артыкул 1 Закона "Аб вайсковай службе" таксама кажа, што *"парадак праходжання грамадзянамі Рэспублікі Беларусь альтэрнатыўнай службы вызначаецца заканадаўствам"*. Аднак, такі закон на Беларусі дагэтуль не прыняты, хаця, напрыклад, яшчэ ў 1993 годзе быў напісаны першы ягоны праект, а ў траўні 2002 – другі.

Канстытуцыя дае грамадзянам права ўдзельнічаць у вырашэнні дзяржаўных спраў як непасрэдна, так і праз свабодна выбраных прадстаўнікоў. Непасрэдна - значыць асабіста, праз грамадзянскія акцыі, праз уплыў на рашэнні чыноўнікаў, а праз свабодна выбраных прадстаўнікоў, - значыць праз дэпутатаў. Разглядзім жа гэтыя мажлівасці ўплыву на змену закона.

**Б.** Уплыў на змену закона праз дэпутатаў і чыноўнікаў звязаны з нашым грамадзянскім правам удзельнічаць у вырашэнні дзяржаўных спраў у краіне.

Ты можаш сам стаць дэпутатам, калі цябе абяруць у мясцовыя прадстаўнічыя органы ўлады ці Парламент, альбо ты можаш аддаць голас за свайго прадстаўніка ў такіх органах. Для таго, каб мець магчымасць галасаваць і быць абраным – валодаць выбарчым правам, трэба дасягнуць пэўнага ўзросту. З 18 гадоў ты можаш галасаваць. Таксама з 18 гадоў ты можаш быць абраны дэпутатам мясцовага савету, а з 21 года - дэпутатам Парламента.

Табе яшчэ можа не быць 18 год, але ты таксама маеш права патрабаваць ад свайго дэпутата добрага выканання перадвыбарчых абяцанняў, бо ты жывеш тут, тут жывуць, працуюць і плоцяць падаткі (з якіх утрымліваюцца ўсе чыноўнікі дзяржаўных органаў, у


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

тым ліку і дэпутаты!) твае бацькі, а неўзабаве падаткі будзеш плаціць і ты.

Дэпутат можа быць сам зацікаўлены ў тым, каб дапамагчы табе, бо яму важна, каб рос яго грамадскі аўтарытэт дзеля наступнага пераабрання ці росту па службовай лесвіцы. Але некаторым з дэпутатаў варта нагадваць, што акрамя абрання дэпутата, існуе і адваротны шлях – адкліканне. Мажлівасць быць адкліканым накладае на дэпутата больш адказнасці за вырашэнне пытанняў, што ляжаць у сферы яго кампетэнцыі, ці на якія ён можа так ці інакш паўплываць.

Трошкі па-іншаму выглядае справа з дзяржаўнымі чыноўнікамі, якія адказваюць за выкананне законаў і прыняццё падзаконных актаў. На розных дзяржаўных узроўнях існуе свой механізм унясення зменаў, удасканаленняў, тлумачэнняў законаў. Тут таксама можна адстойваць законныя інтарэсы, бо чыноўнікі зацікаўленыя ў тым, каб законы выконваліся эфектыўна, тым больш, што гэта - іх абавязак.

***Стратэгія плённага ўплыву, як на чыноўнікаў, так і на дэпутатаў выглядае падобна, нягледзячы на розніцу ў іх паўнамоцтвах і ролях у дзяржаве:***

1. Пастаў перад сабой мэты і вызначы план дзеянняў згодна з мэтамі;

2. Добра падрыхтуйся да сустрэчаў (напрыклад, падрыхтуй варыянты вырашэння пытанняў, каб чыноўнік прыняў лепшае рашэнне, а дэпутат ведаў, у якім накірунку ён можа дзейнічаць);

3. Вызначы хто прымае рашэнні па падобных пытаннях, а таксама канкрэтную адказную асобу, у кампетэнцыі якой знаходзіцца прыняццё адпаведнага рашэння адносна змены падзаконнага акта, альбо – у выпадку змены ці прыняцця закона – адшукай дэпутата ад сваёй акругі альбо дэпутата, які б працаваў у адпаведнай камісіі ў Парламенце (напрыклад, змены закона "Аб вайсковай службе" і ўвядзенне альтэрнатыўнай службы патрабуюць умяшальніцтва чыноўнікаў Міністэрства абароны альбо дэпутатаў з Парламенцкай камісіі па пытаннях абароны);

4. Запішыся на асабісты прыём да чыноўніка ці дэпутата альбо запрасі гэтых асобаў у школу, на дыскусію ці круглы стол (з удзелам ці без удзелу прэсы), дзе можна выкласці свае аргументы;

5. Калі чыноўнік ці дэпутат зможа падтрымаць прапанову па змене закона толькі маральна (выкажацца "за" прапанову, але скажа, што не ў стане


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

паўплываць на прыняццё рашэння), папрасі, каб ён падпісаў папярэдне падрыхтаваны ліст (петыцыю) у падтрымку ініцыятывы па змене закона. Трэба, каб гэтая дзяржаўная асоба бачыла, што за жаданнем змяніць закон стаіць канкрэтная грамадская ініцыятыва, якая знайшла шмат прыхільнікаў.

**Петыцыя – форма звароту ў выглядзе ліста з подпісамі ў падтрымку пэўнай прапановы, які дасылаецца ва ўсе ўстановы, што маюць магчымасць паўплываць на вырашэнне той ці іншай праблемы (адносна зваротаў глядзі адпаведную главу).**

Петыцыя павінна выглядаць як невялікі ліст, мець яскравую, простую і кароткую назву, кароткае апісанне праблемы і крокі яе вырашэння, месца для подпісаў у падтрымку, інфармацыю аб вашай арганізацыі ці ініцыятыве.

*Вось прыклад петыцыі:*

**У Парламент Рэспублікі Беларусь**
**Абласныя выканаўчыя камітэты**
**Абласныя саветы народных дэпутатаў**
**Сродкі масавай інфармацыі (па спісу)**

**Спыніце забойства!**

Вось ужо некалькі гадоў на Беларусі праводзіцца бесчалавечная палітыка знішчэння бяздомных катоў і сабак. Колькі ж можна трываць катаванні жывёлаў? Адпаведны артыкул аб крымінальнай адказнасці за такія дзеянні так і не быў уключаны ў прыняты Крымінальны кодэкс. На якім жа прыкладзе растуць нашыя дзеці?

Мы выказваем сваю занепакоенасць зверскімі адносінамі да жывёл, што адбываецца на вачах нашых дзяцей, і заклікаем дэпутатаў Парламента Рэспублікі Беларусь неадкладна падрыхтаваць і прыняць закон "Аб абароне правоў жывёлаў", каб не дапусціць бесчалавечнага знішчэння братоў нашых меншых.

**У імя выхавання гуманнага і чалавечнага падрастаючага пакалення, мы, грамадзяне Беларусі, заклікаем Вас да прыняцця адпаведнага закона!**

Подпісы для петыцыі збірае ініцыятыўная група "За братоў меншых" (Гродна, БЛК 45-13 т. 816-338)

| | Імя, Прозвішча | Адрас | Подпіс і дата |
|---|---|---|---|
| | | | |


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

Заўсёды трэба быць гатовым да нечаканасцяў і правалаў, але не варта апускаць рукі. У наступнай частцы, прысвечанай ўплыву на змену закону праз грамадзянскі ўдзел (акцыі), ты можаш пераканацца, што шмат залежыць ад цябе.

**В.** Іншай рэальнай мажлівасцю твайго ўплыву на змену закона з'яўляюцца грамадзянскія акцыі.

Грамадзянскія акцыі – адзін са спосабаў удзелу грамадзян у вырашэнні грамадска значных праблем, які можна назваць **грамадзянскім удзелам**. Мы спынімся на дзвюх (як нам падаецца, асноўных) формах грамадзянскага ўдзелу:

1) заснаванне ці сяброўства ў грамадскіх аб'яднаннях ці палітычных партыях,

2) правядзенне мірных сходаў і акцыяў пратэсту.

Гэтыя формы грамадскай актыўнасці гарантуюцца нам Канстытуцыяй і рэгулююцца заканадаўствам.

**Свабода аб'яднанняў (асацыяцыяў)** - гэта мажлівасць дабраахвотнага аб'яднання людзей дзеля дасягнення пэўных (законных) мэтаў, а таксама мажлівасць ствараць альбо ўступаць (ці ўстрымлівацца ад уступлення) у прафсаюзы, палітычныя партыі, грамадскія аб'яднанні.

**Свабода мірных сходаў -** гэта мажлівасць правядзення мірных сходаў, дэманстрацый, вулічных шэсцяў, пікетаў і іншых мерапрыемстваў дзеля адстойвання сваёй грамадзянскай пазіцыі.

Перад тым, як звяртацца да згаданых грамадзянскіх акцыяў, неабходна вызначыць найлепшы спосаб, якім у канкрэтным выпадку можна дабіцца ўплыву на змену закона. Гэта сур'ёзнае рашэнне, якое павінна быць часткай агульнай стратэгіі (нароўні з уплывам на пазіцыю дэпутатаў ці рашэнні чыноўнікаў), але неабходна памятаць, што ў любым выпадку канчатковая мэта - змена канкрэтнага закона ці падзаконнага акта. Калі дзеля змены закона і ўплыву на грамадства прымаецца рашэнне аб заснаванні грамадскага аб'яднання ці палітычнай партыі, неабходна звярнуцца да адпаведных законаў, дзе дакладна распісаная працэдура іх


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

фарміравання і рэгістрацыі. Стварэнне арганізацыі ці ініцыятывы, якая на працягу доўгага часу будзе займацца вырашэннем той ці іншай задачы (напрыклад, адстойвання правоў прызыўнікоў), можа прынесці больш выніку, чым выхад на вуліцы, бо грамадзяне, аб'яднаныя адзінай мэтай, могуць разам зрабіць болей, чым найлепей арганізаваная масавая грамадзянская акцыя.




Нельга недаацэньваць і значнасці мірных сходаў. На Беларусі існуе спецыяльны парадак правядзення масавых шэсцяў для прыцягнення ўвагі грамадства да праблемаў. Падаваць заяўку на правядзенне масавай акцыі могуць толькі зарэгістраваныя палітычныя партыі ці грамадскія аб'яднанні, таму як раз сяброўства ў палітычнай партыі ці грамадскім аб'яднанні можа быць спрыяльным фактарам пры жаданні змяніць закон праз масавыя мерапрыемствы.

Напярэдадні і падчас грамадзянскіх акцыяў і іншых кампаніяў па ўплыву на змену закона неабходна распаўсюджваць інфармацыю аб дзейнасці, праблеме ці ініцыятыве. Дапамагчы ў гэтым павінны звароты ў сродкі масавай інфармацыі (СМІ). Зварот у СМІ можна выкарыстоўваць паралельна з уплывам праз дэпутатаў, чыноўнікаў і праз грамадзянскія акцыі. У СМІ найлепей даслаць напісаны артыкул, дзе варта апісаць праблему, аргументы і копію зваротаў ці іншых адозваў у афіцыйныя органы, а таксама рэакцыю на іх.

Натуральна, што ў нашай краіне, таксама як і ў іншых, ёсць перашкоды на шляху правядзення грамадзянскіх акцыяў, аднак не трэба забывацца, што гэта - канстытуцыйнае права грамадзян Беларусі. Іншая справа, наколькі гэтыя метады будуць дзейснымі для ўплыву на змену заканадаўства.

Памятайце, аднак, што аднымі толькі грамадзянскімі акцыямі часам немажліва дасягнуць поспеху, бо ўплыў на змену закона


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

будзе мінімальным ці частковым. Толькі спалучэнне ўплыву на дэпутатаў, чыноўнікаў, а таксама добра падрыхтаваныя грамадзянскія акцыі (іншымі словамі - наша грамадзянская актыўнасць!) дадуць плён.

Мы высветлілі, што законы - рэч "жывая", якая можа змяняцца, і ты здольны аказаць свой уплыў на гэта. Паўплываць на змену закона ці іншых прававых нормаў ты можаш рознымі шляхамі, сярод якіх найбольш эфектыўнымі з'яўляюцца ўплыў на дэпутатаў, якія прымаюць законы, ўплыў на рашэнні, што прымаюцца чыноўнікамі для выканання законаў, уплыў праз ціск грамадзянскай супольнасці (мірныя акцыі) і з дапамогай СМІ. Набор метадаў можа змяняцца, але мы назвалі гэта **стратэгіяй уплыву на змену закона**. Можна і трэба ўплываць на змену закона, эфектыўна стасуючы ўсе метады адразу, але ў рэшце рэшт усё залежыць толькі ад канкрэтнага закона, ад дэпутата ці чыноўніка, якія прымаюць рашэнні і… ад тваёй актыўнай пазіцыі грамадзяніна сваёй краіны, які гатовы скарыстаць сваё канстытуцыйнае права і гатовы шмат зрабіць для пабудовы дэмакратычнай краіны.

**Хатняе заданне:**

1. Уявіце сабе, што на бліжэйшай сесіі Парламент збіраецца разглядзець пытанне ўнясення зменаў у Закон "Аб вайсковай службе" у частцы ўвядзення альтэрнатыўнай службы на Беларусі. Вызначыцеся, вы "за" ці "супраць" прапанаванага ўнясення паправак у закон "Аб вайсковай службе" і ўвядзення альтэрнатыўнай вайсковай службы на Беларусі. Прадумайце і запішыце не менш, чым па тры аргументы "за" і "супраць" увядзення альтэрнатыўнай службы на Беларусі, якія дапамогуць вам эфектыўна выпрацаваць стратэгію дзеянняў па змене дадзенага закона.
2. Каму і куды вы адрасавалі бы пісьмовы зварот у падтрымку сваёй пазіцыі?
3. Напішыце ў сшытку прыклад петыцыі (ці падобнага пісьмовага звароту), выкарыстоўваючы аргументы з задання 1.


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

4. Прааналізуйце, якая форма грамадзянскага ўдзелу будзе найбольш эфектыўнай для аказання ўплыву на змену закона "Аб вайсковай службе" у частцы ўвядзення альтэрнатыўнай службы.
5. Якія канкрэтныя крокі вы б прадпрынялі? Запішыце іх і абгрунтуйце.


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

# ЗВАРОТ ДА ЮРЫСТА

***У гэтай главе мы звернемся да пытанняў, якія узнікаюць у нас звычайна ў сувязі з крытычнымі жыццёвымі сітуацыямі, якія патрабуюць кваліфікаванай дапамогі юрыста. Размова ў главе пойдзе аб тым, дзе можна атрымаць такую дапамогу, як правільна і якасна яе атрымаць.***

**А.** Мы ўжо шмат даведаліся аб тым, што такое права, законы, хто займаецца іх стварэннем, а таксама мы ведаем пра тое, як мы самі можам абараніць свае правы, калі яны парушаны. Мы разглядалі розныя жыццёвыя сітуацыі, з якіх самі спрабавалі знайсці практычны выхад. Але ж, як вы ведаеце, не ўсё атрымоўваецца заўсёды так, як мы запланавалі, і не ўсё мы ў стане вырашыць самастойна.

Здаецца цалкам зразумела, што, калі ў нас нешта сур'ёзна ці, нават не сур'ёзна, забаліць, трэба звяртацца да доктара. Таму што здароў'е вельмі важнае для кожнага чалавека. Чаму ж тады так адбываецца ў выпадку сутыкнення з сітуацыяй, для вырашэння якой патрабуецца веданне права, што мы звычайна намагаемся ці вырашыць яе самастойна, ці ідзем за дапамогай да сяброў і знаёмых? Ці можа гэта не так сур'ёзна як здароўе?

На самой справе часам здараецца, што неправільнае, некваліфікаванае вырашэнне праблемы прававога характару прыводзіць да такіх вынікаў, што аб добрым здароў'і прыходзіцца забыць на доўгі час. Каб пазбегнуць такіх непрыемнасцяў і быць больш упэўненымі ў добрым выніку вырашэння праблемы, лепш, як і ў выпадку хваробы, звярнуцца да спецыяліста, які акажа нам кваліфікаваную юрыдычную дапамогу.

**Юрыдычная дапамога - кваліфікаваная дапамога ў складаных прававых сітуацыях, якую аказваюць грамадзянам і арганізацыям на падставе іх зварота спецыялісты, якія маюць юрыдычную адукацыю і працуюць па спецыяльнасці, ці па-іншаму - юрысты.**



*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

**Б.** Такім чынам, калі пытанне, пастаўленае жыццём, аказалася занадта складаным для самастойнага вырашэння, паўстае неабходнасць у падказцы з боку спецыяліста-юрыста. Толькі дзе і як іх шукаць гэтых спецыялістаў? Пра гэта зараз і паразмаўляем.

Вось уявіце сабе, здарылася такая сітуацыя:

Летам, падчас адпачынку ў бабулі, Пётр і Аляксей працавалі у калгасе "Воўпа" Ваўкавыскага раёна на праполцы буракоў і на сенажаці. Паколькі хлопцам споўнілася толькі па 15 год, брыгадзір згадзіўся на тое, каб яны працавалі, але адмовіўся заключаць з хлопцамі дамовы, запэўніўшы, што яны атрымаюць усе грошы праз сваю бабулю. На працягу двух месяцаў Пётар і Аляксей спраўна выконвалі ўсе заданні, якія перад імі ставіліся. У дзень атрымання заробку бабуля хлопцаў атрымала для Пятра і Аляксея ў два разы менш грошай, чым брыгадзір абяцаў раней. Хлопцы вырашылі дабівацца ад брыгадзіра вярнуць усе грошы.

Як вы думаеце, куды можна звярнуцца ў дадзеным выпадку за юрыдачнай дапамогай? Гэта звычайна першае пытанне, якое ўзнікае ў чалавека, які апынуўся ў складанай сітуацыі, якая патрабуе ўмяшальніцтва спецыяліста. У нашай справе – юрыста.

**Па-першае**, для таго, каб мець найлепшы вынік пры вырашэнні нашай справы, мы павінны звярнуцца да адпаведнага юрыста, які спецыялізуецца на вырашэнні менавіта такіх пытанняў, як наша. Справа ў тым, што права - вельмі шырокая навука, і юрысты звычайна маюць вузкую спецыялізацыю. Таксама, дарэчы, як і ўрачы. Менавіта таму карысна ведаць, хто і якога роду дапамогу можа нам аказаць.

***Юрыдычную дапамогу могуць аказваць згодна закона:***

- Адвакаты, сябры Калегіі адвакатаў. Спецыялізуюцца на дапамозе па крымінальных, гаспадарчых і грамадзянскіх справах.
- Супрацоўнікі юрыдычных фірмаў, якія спецыялізуюцца на аказанні юрыдычных паслуг па асобных галінах права (нерухомасць, дзейнасць юрыдычных асобаў, сямейнае права, жыллёвае права, грамадзянскае права)


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

•Супрацоўнкі натарыяльных кантор - натарыусы. Спецыялізуюцца на афармленні здзелак і важных дакументаў, такіх як дагаворы і даверанасці.

•Грамадскія аб'яднанні, якія аказваюць юрыдычную дапамогу асобным катэгорыям насельніцтва на бязвыплатных пачатках. (Арганізацыі, якія займаюцца абаронай правоў чалавека, Таварыствы абароны правоў спажыўцоў, прафсаюзы)

•Юрыдычныя клінікі пры юрыдычных вышэйшых навучальных установах. Аказваюць юрыдычную дапамогу малазабяспечаным грамадзянам на бясплатнай аснове.

•Таксама прававую дапамогу могуць аказаць пракуратура, міліцыя, супрацоўнікі судовых установаў.

У нашым выпадку адзін з добрых варыянтаў – зварот да юрыста, супрацоўніка якой-небудзь юрыдычнай кансультацыі, якая спецыялізуецца на вырашэнні працоўных спрэчак. Ці ў юрыдычную клініку, таму, што там дапамогу непаўналетнім акажуць бясплатна. Але могуць быць і іншыя варыянты.

**Па-другое**, пасля таго, як мы вызначыліся, якой спецыялізацыі юрыст нам патрэбен, трэба даведацца, дзе знаходзіцца неабходны нам спецыяліст. А, значыцца, мы будзем шукаць адрасы і тэлефоны. Здаецца, першае, што прыходзіць у галаву - гэта адчыніць тэлефонны даведнік і пашукаць адрасы і тэлефоны юрыдычных кансультацый, раённых адвакацкіх калегіяў і грамадзскіх аб'яднанняў, якія займаюцца аказаннем юрыдычнай дапамогі. Гэта адзін са шляхоў. Ёсць і іншыя. Напрыклад, у газетах, дзе друкуюцца рэкламныя абвесткі розных юрыдычных фірмаў і арганізацыяў пра аказанне прававой дапамогі. Яшчэ адна добрая крыніца інфармацыі - гэта сябры і знаёмыя. Крыніца гэтая добрая тым, што ад сяброў і знаёмых, хучэй за ўсё, можна будзе даведацца не толькі хто і дзе, але таксама і шмат іншай карыснай інфармацыі, а таксама атрымаць пэўныя парады. А парады гэтыя могуць тычыцца ў тым ліку і кошту дапамогі.

І гэта **па-трэцяе.** Справа ў тым, што часцей за ўсё наш непакой выклікае менавіта тое пытанне, а колькі будзе каштаваць паслуга з боку юрыста. У большасці выпадкаў гэтыя паслугі, як і


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

многія іншыя, - платныя. У залежнасці ад складанасці пытання вызначаецца і кошт. Звычайная першасная кансультацыя ў юрыдычнай канторы, напрыклад, каштуе каля 1 базавай стаўкі (10-15 тысяч рублёў). Далей кошт вызначаецца па дамоўленасці. Для большай упэўненасці ў сваіх фінансавых мажлівасцях рэкамендуецца спытаць пра тое, колькі будзе «каштаваць» вашая праблема, адразу па тэлефоне пры папярэдняй размове і дамаўленні аб сустрэчы з юрыстам.




Існуе таксама і бясплатная юрыдычная дапамога. Яна аказваецца:

- адвакатамі, якія прызначаюцца для абароны абвінавачваемага ў здзяйсненні цяжкага крымінальнага злачынства ці непаўналетняга абвінавачваемага. Авакатаў накіроўвае мясцовая Калегія адвакатаў, дзе яны працуюць і атрымоўваюць звычайны сталы заробак - таму іх паслугі для кліента бясплатныя;
- грамадскімі аб'яднаннямі, якія спецыялізуюцца на аказанні юрыдычнай дапамогі насельніцтвую Але ж звычайна яны аказваюць дапамогу па выпадках парушэнняў правоў чалавека;
- грамадскімі прыёмнымі (ці навучальнымі Юрыдычнымі клінікамі) пры вышэйшых навучальных установах. Кансультаванне кліентаў там адбываецца ў рамках навучання студэнтаў-юрыстаў старэйшых курсаў пад наглядам юрыста-прафесіянала. Для таго, каб атрымаць кансультацыю там, вы павінны ўваходзіць у адну з катэгорыяў грамадзян, якім аказваецца дапамога ў Юрыдычнай клініцы. Гэта звычайна малазабяспечаныя прадстаўнікі насельніцтва – пенсіянеры, адзінокія бацькі, студэнты, школьнікі, беспрацоўныя і інш.

**В.** Гэта, відаць, усё, што трэба ведаць перад тым як звярнуцца да юрыста. Мы ведаем сваю праблему і ведаем, да якога юрыста хочам з ёй звярнуцца. Цяпер можна дамаўляцца аб сустрэчы.

Папярэдняя дамоўленасць аб часе сустрэчы і сутнасці праблемы можа быць дасягнута па тэлефоне. Трэба памятаць, што сур'ёзнай кансультацыі па тэлефоне не бывае. Звычайна ва ўсіх


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

юрыдычных кансультацыях, фірмах, грамадскіх аб'яднаннях прыёмам тэлефанаванняў займаецца ці дзяжурны юрыст арганізацыі, ці сакратар. З ім мы і будзем размаўляць. Пад час тэлефоннай размовы мы павінны:

**Прывітацца і назваць сябе**

**Патлумачыць, з якой нагоды мы тэлефануем**

**Спытаць, ці займаецца такой праблематыкай дадзеная кансультацыя**

**Спытаць колькі папярэдне будзе каштаваць кансультацыя**

**Калі кошт нас задавальняе, папрасіць параіць, да каго з юрыстаў кансультацыі можна звярнуцца за дапамогай**



**Вызначыць канкрэтны дзень і час, на які нам зручна прызначыць сустрэчу**

**Пазначыць сабе ў нататніку гэтую дату і час, а таксама прозвішча юрыста, да якога нас накіравалі**

**Пакінуць свае каардынаты - імя, прозвішча, адрас, тэлефон**

І вось час нашай сустрэчы з юрыстам падыйшоў. Мы ідзем на сустрэчу, ад якой залежыць вырашэнне нашай праблемы, і таму мы павінны:

**<u>4 Правілы</u>:**

- *Не спазняцца на сустрэчу.*
- *Захапіць усе дакументы і паперы (ці лепей іх копіі), якія могуць быць карыснымі для больш дакладнага высвятлення сутнасці праблемы, а значыцца - больш якаснага яе вырашэння.*
- *Падрыхтаваць пытанні да юрыста, якія мы хацелі б абавязкова высветліць. Лепш, калі яны быдуць занатаваны ў нас пісьмова, для таго, каб не забыцца пра што-небудзь важнае пад час сустрэчы.*
- *Дакладна вызначыць для сябе, які практычны вынік мы хочам атрымаць у выніку вырашэння праблемы.*

Адчыняем дзверы юрыдычнай кансультацыі. Часцей за ўсё нас сустрэне ці дзяжурны юрыст кансультацыі, ці сакратар. Трэба прывітацца, назваць сябе, назваць прозвішча таго юрыста, з якім у


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

нас дамоўлена сустрэча і час, на які мы дамовіліся папярэдне па тэлефоне. Таксама пытаемся пра умовы аплаты: аплата да кансультацыі ці пасля яе. Пасля гэтага нас накіруюць да адпаведнага спецыяліста. Мы заходзім у кабінет, вітаемся, прадстаўляемся, сядаем і кансультацыя пачынаецца. Трэба памятаць, што юрыст таксама чалавек, і таму мы павінны:

- быць ветлівымі і адпаведна чакаць ветлівасці з боку юрыста;
- дакладна, поўна і праўдзіва расказаць аб той праблеме, з якой мы звяртаемся. Не трэба баяцца, што юрыст усім сваім і нашым знаёмым раскажа аб нашай праблеме. Юрысты прытрымліваюцца правілаў юрыдычнай этыкі, якія забараняюць ім абмяркоўваць са знаёмымі і незнаёмымі праблемы сваіх кліентаў;
- прадаставіць юрысту магчымасць азнаёміцца з тымі дакументамі, якія у нас ёсць у наяўнасці;
- па магчымасці праўдзіва адказаць на тыя пытанні, якія ўзнікнуць у юрыста;
- паведаміць юрысту, які вынік мы чакаем ад вырашэння справы;
- папрасіць юрыста прапанаваць магчымыя спосабы вырашэння пытання;
- не чакаць, што юрыст адразу, як фокуснік, вырашыць праблему. Магчыма, гэта так і будзе. Але ж часцей за ўсё спатрэбіцца прыйсці яшчэ раз, а можа і яшчэ не раз для канчатковай кансультацыі. Так адбываецца таму, што заканадаўства, як мы ўжо зразумелі, гэта зусім не адзін закон. І таму, нават юрыст-прафесіянал усіх палажэнняў законаў не ў стане ўтрымаць у галаве, яму патрэбен час для дакладнай праверкі. Можам быць упэўнены амаль на 100%, што кансультацыя, якая даецца адразу, на самой справе будзе не настолькі якасная, чым тая, якая даецца праз пэўны час;



- занатаваць усе, на наш погляд, важныя моманты размовы;
- не зацягваць свайго візіту і не спрабаваць паскардзіцца юрысту на ўсе жыццёвыя непрыемнасці, якія не тычацца сутнасці справы;
- дакладна дамовіцца пра дзень і час наступнай сустрэчы. Пазначыць гэтыя звесткі ў сваім нататніку;
- даведацца аб тым, колькі будзе каштаваць наступная кансультацыя;
- развітацца.


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

Пад час сустрэчы мы таксама вельмі шмат можам даведацца па розных прыкметах аб тым, ці заслугоўвае даверу гэты юрыст. Ён павінен у любым выпадку паводзіць сябе прыстойна і ветліва – гэта файная і важная рыса любога чалавека. Назіраем уважліва: ён не перабівае нас, слухае зацікаўлена і не адцягвае сваю ўвагу на тэлефон, свайго супрацоўніка, іншага кліента, газету - добра. Ён запісвае і пазначае найбольш важныя моманты размовы, не кажа, што у нас не праблема, а смех -добра. І не намагаецца відавочна пазбавіцца ад нас як мага хучэй – таксама добра.

Калі нашыя назіранні паказваюць, што гэтыя прыкметы, ці хаця б некаторыя з іх, у нашага спецыяліста адсутнічаюць, мы можам з чыстым сумленнем спакойна развітацца і пайсці пашукаць іншага, з якім нам будзе больш прыемна кантактаваць. Калі мы папярэдне заплацілі за кансультацыю, таксама са спакойным сумленнем мы забіраем свае грошы на той падставе, што не атрымалі чакаемую паслугу.

Такім чынам, калі ў жыцці здараюцца складаныя сітуацыі, якія патрабуюць кваліфікаванай юрыдычнай дапамогі, мы заўсёды можам лічыць на гэтую дапамогу з боку спецыялістаў-юрыстаў, якія як на платных, так і на бязвыплатных пачатках, нам акажуць яе ў час і якасна. А якасць падобных паслуг, у сваю чаргу мы павінны памятаць аб гэтым, залежыць не толькі ад прафесіяналізму юрыста, але таксама і ад таго, як мы паставімся да пошуку і атрымання прававой дапамогі.

Часам у жыцці ўзнікаюць мелкія пытанні, адказы на якія не абавязкова шукаць у спецыяліста-юрыста. Часам дастаткова ведаць нейкую элементарную інфармацыю з заканадаўства для таго, кабы дапамагчы сабе самаму. І таму зараз яшчэ трошкі інфармацыі аб тым, дзе можна самастойна знайсці закон.




©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

**ПАМЯТКА**

1. Як мы ўжо ўзгадвалі ў главе аб стварэнні законаў - усе законы друкуюцца ў газетах «Звязда» і «Народная газета». Таму, калі вам патрэбен нейкі закон, вы можаце пайсці ў бібліятэку і пашукаць яго ў каталогу. Адзіная нязручнасць - вы павінны ведаць, як ён дакладна называецца і калі быў прыняты.
2. Таксама ёсць перыядычнае выданне парламента «Ведамасці Нацыянальнага схода Рэспублікі Беларусь». Там друкуецца большасць прынятых нарматыўных актаў. «Ведамасці» можна знайсці ў бібліятэцы таксама.
3. Адзін з самых простых спосабаў - пошук у электроннай базе дадзеных прававой інфармацыі «Эталон», «КансультантПлюс» ці нейкай іншай, якія ўсталёўваюцца, як праграмы, на кампутар і шукаюць нарматыўныя акты нават па слову, якое можа ўтрымлівацца ў гэтым акце.
4. Інтэрнэт - таксама нядрэнная крыніца. Сайт Цэнтра прававой інфармацыі Адміністрацыі Прэзідэнта www.ncpi.gov.by
5. Яшчэ спосаб - проста спытаць у знаёмага юрыста, дзе, у якім законе можна паглядзець адказ на ўзнікшае пытанне.

Але ж, як мы разумеем, спробы вырашыць нашыя праблемы з дапамогай уласнага нашага шукання, чытання і разумення законаў нечым падобныя на самалячэнне. Так адбываецца, калі у нас з'явіліся нейкія прыкметы хваробы, а мы замест доктара звяртаемся да медыцынскай энцыклапедыі. Ніхто не кажа, што мы абавязкова няправільна вызначым па прыкметах нашую хваробу і будзем лячыць тое, што трэба. Але ж, часам, лепей усё ж не рызыкаваць...

**Хатняе заданне:**

1. Прачытайце яшчэ раз выпадак, якія прапанаваны ў главе. Адзначце ў сшытку, куды могуць звярнуцца за дапамогай хлопцы.
2. Падумайце і запішыце таксама, што яны павінны зрабіць да кансультацыі, як павінны да яе падрыхтавацца.


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

# СУДОВАЯ АБАРОНА

***З папярэдніх главаў вы даведаліся пра тое, што такое закон і як ён ствараецца, як можна змяніць дрэнны закон, а таксама як выконваецца закон. Гэтая глава будзе прысвечана таму, што рабіць у выпадку, калі ў адносінах да нас парушаны закон.***

**А.** Хутчэй за ўсё ты не раз у жыцці сустракаўся з сітуацыямі, калі парушаўся закон. Гэта магло здарацца як непасрэдна з табой ці тваімі знаёмымі, так і ў тых гісторыях, якія ты напэна чуў. Гэтыя выпадкі маглі мець як шчаслівае заканчэнне, так і не вельмі. Прапануем тваёй увазе адзін з выпадкаў, калі парушэнне закона прывяло да вельмі складанай сітуацыі.

Аднойчы нядзельнай раніцай Алесь Сямёнавіч Кашук выйшаў ва двор свайго прыватнага дома. Раптам ён пачуў нейкую мятусню каля свайго нядаўна пастаўленага плота. Пацягнуўшыся, ён падыйшоў бліжэй і ўбачыў, што плот пачаў нахіляцца і з трэскам паламаўся. У гэты самы момант ад плота пусціліся наўцёк два маладзёны, у адным з якіх Алесь Сямёнавіч пазнаў 13-гадовага Васіля, малодшага сына свайго суседа Мікалая Казіміравіча Пецука, з якім яны на працягу апошніх пяці год знаходзіліся ў сварцы з-за непадзеленай прошлым летам дзялянкі для пакоса. Раз'юшаны, Кашук схапіў паляўнічую стрэльбу, запраўленую соллю, і кінуўся за маладзёнамі, аднак тых і след прастыў.

Да бацькі свайго крыўдзіцеля сп. Кашук нават не збіраўся ісці, разумеючы, што сусед, з якім ён знаходзіцца ў кепскіх стасунках, нават размаўляць з ім не будзе. Ды і не вельмі хацеў сп. Кашук кланяцца свайму даўняшняму ворагу.

***Ці трапляў ты ці твае знаёмыя ў падобныя сітуацыі?***
***Як ты лічыш, што ў такой сітуацыі можа зрабіць сп. Кашук?***

Вось такая здарылася гісторыя. Што мы маем - паламаны плот, сварка паміж суседзямі, якія і так знаходзяцца ў кепскіх


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

адносінах... Нават стрэльба, якая хоць і запраўлена соллю, але ўсё ж такі можа пальнуць... Не вельмі вясёлая карцінка малюецца, праўда?

Аднак, законы нашай краіны даюць магчымасць вырашыць склаўшуюся сітуацыю цывілізаванымі метадамі. А менавіта: Алесь Сямёнавіч Кашук можа звярнуцца ў суд для абароны сваіх парушаных (у дадзеным выпадку маёмасных – бо была сапсавана яго маёмасць) правоў. Іншымі словамі, у тых выпадках, калі нашыя правы ці інтарэсы закрануты нечымі незаконнымі дзеяннямі, гэта значыць, што ў адносінах да нас **парушаецца закон**. І тады па сваю абарону мы маем магчымасць звярнуцца ў судовая органы.

Менавіта суд з'яўляецца той установай, якая павінна вырашыць, ці было здзейснена парушэнне закона і якое, а потым, ужыўшы ўладу, прыцягнуць парушальніка да адказнасці. Такая ўлада належыць у нашай краіне толькі **судам**. Гэта правіла замацавана ў главе 6 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Суды падзяляюцца на **агульныя, гаспадарчыя і ваенныя**.



Агульныя суды – гэта звычайныя суды для вырашэння спрэчак і канфліктаў паміж асобнымі грамадзянамі, якія пражываюць на пэўнай тэрыторыі.

Гаспадарчыя суды разглядаюць справы і спрэчкі з удзелам камерцыйных арганізацый і прадпрымальнікаў, у тым выпадку, калі гэтыя справы звязаныя з іх прадпрымальніцкай дзейнасцю.

Ваенныя суды разглядаюць толькі справы з удзелам вайскоўцаў, якія служаць у арміі.

У залежнасці ад віда парушаных правоў грамадзяніна, суды могуць разглядаць **крымінальныя, грамадзянскія ці адміністрацыйныя справы**. Крымінальныя справы – гэта справы, калі парушаныя найбольш значныя правы, такія як права на жыццё, на бяспеку, на ахову здароўя, ахову нашай уласнасці і некаторыя іншыя. Напрыклад, забойства, крадзеж, тэрарызм. Дзейнасць па раскрыццю і падрыхтоўцы да суда крымінальных справаў вядуць спецыяльныя дзяржаўныя органы – міліцыя, пракуратура,


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

падаткавая паліцыя. Грамадзянскія справы – гэта справы, якія звязныя з парушэннем нечых маёмасных правоў, і тут ініцыятыва па давядзенню справы да суда ляжыць выключна на пацярпелых баках. Гэта спрэчкі аб раздзеле маёмасці і спадчыны, аб кампенсацыі нанесенай шкоды і жыллёвыя спрэчкі, а таксама шмат іншых. Гэта самая вялікая частка усіх справаў, якія патрапляюць у суды ўвогуле. Таму што з гэтымі рэчамі мы маем справу кожны дзень. І, нарэшце, адміністрацыйныя справы – гэта справы па незначнаму парушэнню законаў. Напрыклад, безбілетны праезд, дробнае хуліганства, парушэнне правілаў дарожнага руху.

На сённяшні дзень у заканадаўстве пазначана магчымасць стварэння асобных судоў для непаўналетніх, якія б займаліся выключна справамі з удзелам асобаў надасягнуўшых 18 год, для таго каб па магчымасці больш улічваць асаблівасці іх спраў і абаранць іх правы больш якасна. Але па розных прычынах такіх судоў пакуль што ў Беларусі няма. Справы з удзелам непаўналетніх разглядаюцца ў агульным парадку звычайнымі судамі.

Яшчэ ў адпаведнасці з адміністратыўна-тэрытарыяльным падзелам Беларусі суды падзяляюцца адпаведна на **раённыя (гарадскія)**, **абласныя суды** і **Вярхоўны суд Рэспублікі Беларусь**.

Гэты падзел падобны да лесвіцы. На самай першай прыступцы гэтай лесвіцы знаходзяцца раённыя і гарадскія суды. Гэта так званая першая судовая інстанцыя. Перш за ўсе справа трапляе у суд таго раёна ці горада, дзе жыве парушальнік. Колькасць раённых і гарадскіх судоў досыць вялікая – як мінімум адзін на кожны горад. Там адбываецца разгляд справы і па ёй выносіцца рашэнне.

Калі гэтае рашэнне не задавальняе кагосьці з бакоў, ці падчас яе разгляду быў парушаны закон, рашэнне суда першага ўзроўню можна абскардзіць. Як пішацца скарга мы пазнаёміліся раней у главе “Абскарджанне дзеянняў службовых асобаў”. І тады мы падымаемся на прыступку вышэй і скарга будзе ўжо разглядацца ў абласным судзе, які знаходзіцца ў кожным абласным цэнтры. Гэта – другая інстанцыя – касацыйная. На Беларусі такіх судоў шэсць, па колькасці абласцей і суд горада Мінска, які таксама прыроўнены да абласнога. У гэтых судах адбываецца паўторны разгляд справы і выносіцца


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

рашэнне аб задавальненні скаргі і адмене папярэдняга рашэння, ці аб адхіленні скаргі і пакіданні рашэння без зменаў.

Калі ж і на гэтым узроўні хтосці з бакоў аказваецца не задаволеным рашэннем суда, ці зноў былі адзначаныя парушэнні закона, то тады трэба ўзняцца яшчэ на адну прыступку вышэй. А там знаходзіцца Вярхоўны суд Рэспублікі Беларусь. Ён адзін на ўсю краіну і знаходзіцца ў сталіцы – горадзе Мінску. Вярхоўны суд – гэта вышэйшая судовая інстанцыя. Ён разглядае самыя складаныя справы і справы тых людзей, што не знайшлі абароны сваіх правоў у першых двух інстанцыях. Рашэнні гэтага суда канчатковыя і абскарджанню не падлягаюць.



*У нашай краіне існуе яшчэ адзін судовы орган – **Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь**, які ажыццяўляе кантроль за **канстытуцыйнасцю**, ці адпаведнасцю законаў і іншых нарматыўных актаў Канстытуцыі. У адрозненне ад некаторых іншых краін, грамадзяне нашай краіны не могуць наўпрост звяртацца ў Канстытуцыйны Суд, гэта права належыць толькі Прэзідэнту, Парламенту і Ураду Рэспублікі Беларусь.*

**Б.** Асноўнае прызначэнне судоў – здзяйсненне правасуддзя.

**Правасуддзе – гэта від дзяржаўнай дзейнасці, накіраванай на разгляд і вырашэнне грамадскіх канфліктаў, звязаных з парушэннем прававых норм, які ажыццяўляецца падчас судовага разбіральніцтва.**

Правасуддзе - гэта пошук судом аб'ектыўнай ісціны па справе. Парадак вырашэння і разгляду судовых спраў называецца **судовым працэсам** і вызначаецца у апаведнасці з іх відам Крымінальна-працэсуальным, Грамадзянска-працэсуальным кодэксамі Рэспублікі


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

Беларусь, а таксама Кодэксам аб адміністрацыйных правапарушэннях.

Дзейнасць усіх апісаных вышэй судоў выглядае прыкладна аднолькава.Суд павінен разабрацца ў сутнасці справы і, абапіраючыся на факты, якія былі высветлены падчас судовага разбіральніцтва, прыняць на іх падставе рашэнне. Гэтую дзейнасць у судах ажыццяўляюць суддзі. Яны могуць разглядаць справы як самастойна – адзінасобна, так і разам з іншымі суддзямі – калегіяльна. На Беларусі няма прысяжных засядацеляў, якіх мы прызвычаіліся бачыць ў замежных фільмах, затое ёсць проста засядацелі – іх двое - і разам з судзем яны называюцца судом. Высвятленню сутнасці справы і аднаўленню ісціны спрыяюць замацаваныя ў Канстытуцыі і іншых законах прынцыпы справядлівага судовага працэса (правасуддзя). Разгледзім асноўныя з іх.

## Прынцыпы правасуддзя

### Здзяйсненне правасуддзя толькі судом і на падставе спаборнасці і роўнасці бакоў у працэсе

Гэты прынцып азначае, што толькі суд можа ажыццяўляць ад імя дзяржавы дзейнасць, накіраваную на прыцягненне да адказнасці правапарушальніка і аднаўленне парушаных інтарэсаў. А таксама тое, што як парушальнік, так і пацярпелы ад парушэння маюць у судзе роўнае права на абарону сваіх правоў законнымі спосабамі, прадстаўленне доказаў на карысць сваёй пазіцыі, выкарыстанне дапамогі адваката. Не можа быць прыцяснення ў судзе нечых правоў на падставе расы, нацыянальнасці, сацыяльнага і маёмаснага стану, полу, мовы, адносін да рэлігіі, роду і характару заняткаў, месца жыхарства і іншых абставін.

### Незалежнасць суддзяў і падпарадкаванне іх толькі закону

Згодна з гэтым прынцыпам пры здзяйсненні правасуддзя забараняецца аказваць на суддзяў і іх рашэнні ціск ці любое іншае

пабочнае ўздзеянне. Суддзі вырашаюць справы на падставе толькі законаў Рэспублікі Беларусь і прадстаўленных доказаў.

**Галоснасць судовага разбіральніцтва**

А гэта азначае, што разбіральніцтва спраў ва ўсіх судах адкрытае, і на яго можа прыйсці і папрысутнічаць любы жадаючы, за выключэннем некаторых выпадкаў. Напрыклад, закрытае судовае разбіральніцтва, дапускаецца у мэтах папярэджання абвяшчэння звестак аб інтымных баках жыцця асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, а таксама для забеспячэння таямніцы ўсынаўлення, і калі ёсць пагроза разгалошвання дзяржаўнай таямніцы.

**В**. Для таго, каб распачаць працэс разгляда справы па абароне парушаных правоў грамадзяніна, неабходна фармальная падстава. Гэтай падставай можа быць заява пацярпелага, матэрыялы справы, ці сам факт здзяйснення парушэння.

У нашым выпадку з Алесям Сямёнавічам былі парушаныя яго маёмасныя правы. Такія правы абараняюцца грамадзянскім правам. Грамадзянскія справы ўзбуджаюцца ў адпаведнасці з заявай асобы, якой нанесена шкода. Гэтая асоба называецца **ісцец**. Заява іначай завецца **іскам.** Іск падаецца ў суд па месцу жыхарства той асобы, якая здзейсніла парушэнне і пішацца па правілах напісання заявы. Падаецца ў суд у пісьмовай форме з копіямі па колькасці **адказчыкаў** – тых асобаў, якія на думку ісца парушылі яго правы.



За зварот ў суд і разгляд грамадзянскай справы ісцец таксама павінен заплаціць дзяржаўную **пошліну**. Яна аплочваецца ў памеры 5 % ад кошта іска (але ж не менш 50 % ад усталяванага мінімальнага заробка). Памер пошліны вяртаецца ісцу у выпадку, калі ён выйграе справу.

Пасля прызначэння слуханняў па справе ў судзе, правядзення судовага разбіральніцтва і высвятлення сутнасці справы, суддзя выносіць рашэнне. Гэтым сканчаецца любы судовы працэс.

Ёсць некаторыя адрозенні наступстваў прызанння вінаватым па грамадзянскіх, крымінальных і


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

адміністрацыйных справах. Па грамадзянскіхісках вінаваты бок нясе **матэрыяльную адказанасць** – ён павінен ці кампенсаваць нанесеную шкоду шкоду, ці вярнуць некую рэч, ці падзяліцца некай маёмасцю ў залежнасці ад сутнасці справы. За выкананнем судовага рашэння будзе сачыць зацікаўлены бок разам з судовым выканаўцам. Па крымінальных справах, якія з'яўляюцца, як мы ўжо казалі вельмі сур'ёзнымі, дзяржава законам усталявала суровыя **пакаранні** – пазбаўленне волі, штрафы, канфіскацыю маёмасці. І тут адказанасць за выкананне пакарання бярэ на сябе дзяржава ў асобе спецыяльных органаў, такіх як турмы, пракуратура, спецкамендатуры.

Цяпер вы ведаеце амаль усе пра тое, як працуюць і чым адрозніваюцца розныя суды. Давайце яшчэ раз звернемся да нашага выпадка з паламаным плотам і паглядзім, што ж там адбылося далей, калі надыйшоў дзень суда.

**Прачытай працяг нашай гісторыі:**

Справу разглядаў суддзя Ярашук. Ён нават не падазраваў, што з такой, здавалася б простай справай, будзе столькі праблем. Зранку яму патэлефанаваў сябр, і папрасіў вырашыць справу на карысць сп. Кашука. Аднак з прадстаўленых яму матэрыялаў суддзя Ярашук не бачыў дастатковых доказаў таму, што гэта менавіта Васіль Пецук паламаў плот: не было сведак, а сам Васіль казаў, што нават і не быў тым ранкам каля суседскага плота. Аднак сябр ёсць сябр.

Перад працэсам суддзя выклікаў да сябе Васіля і пагразіў яму, што, калі той не сазнаецца ў зламанні плота, то і ў яго ў школе, і ў бацькі на працы пачнуцца вялікія праблемы, і вогуле бацкам прыйдзецца заплаціць шалёныя грошы і за паламаны плот, і за паслугі юрыста. Пачуўшы, што Васіль працягваў казаць пра сваю невінаватасць, суддзя Ярашук выклікаў міліцыянера і загадаў адвесці Васіля ў асобны кабінет, каб ён там да пачатку судовага разбіральніцтва "падумаў пра сэнс жыцця".

Калі падыйшоў час судовага паседжання, суддзя абвясціў працэс закрытым і выдаліў усіх прысутных з залы паседжаняў. Перад самым разбіральніцтвам ён зайшоў у кабінет, дзе сядзеў Васіль, і яшчэ раз нагадаў яму, што, калі ён не хоча, каб на яго


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

зваліліся ўсе вышэйзгаданыя непрыемнасці, то няхай піша, як разваліў плот сп. Кашука. Васіль расплакаўся і пад дыктоўку суддзі Ярашука напісаў усё, што ад яго патрабавалася. Пасля гэтага суддзя са спакойным сэрцам распачаў працэс. Ён адразу выклікаў Аляксандра Казіміравіча Пецука і, не даўшы яму сказаць ні слова, паведаміў, што на падставе пісьмовых тлумачэнняў яго сына ён прыняў рашэнне аб задаваленні іска сп. Кашука. Сп. Пецук быў абураны рашэннем суддзі.

***Як вы лічыце, ці справялівым быў судовы працэс?***

**Хатняе заданне:**

1. Прачытайце абедзве часткі гісторыі сп. Кашука.
2. Адзначце у сшытку дзеянні суддзі (2 частка выпадка), на якія ён меў права, а на якія – не.
3. Вызначце, якія прынцыпы судовага разбіральніцтва былі парушаны. Адзнач свае меркаванні ў сшытку.
4. Падумайце, што б ты зрабіў на месцы сп. Пецука? Як ён можа абскардзіць дзеянні суддзі Ярашука? Напішыце ў сшытку варыянт скаргі на тое, што здарылася пад час суда.
5. Падумайце, якія яшчэ спосабы вырашэння спрэчкі, акрамя зварота ў суд, вы маглі б прапанаваць бакам?



©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

# ВЫРАШЭННЕ КАНФЛІКТАЎ

***З мінулай главы Вы даведаліся пра судовы шлях вырашэння канфліктных сітуацый. Гэты спосаб урэгулявання спрэчак адзін з найбольш дзейсных, бо рашэнне суда з'яўляецца абавязковым для канфліктуючых бакоў і прыводзіцца ў дзеянне пад наглядам дзяржаўных органаў . Аднак пры звароце ў суд мы заўсёды павінны памятаць, што рашэнне суда часцей за ўсе не залежыць ад нашага жадання, а з'яўляецца аценкай суддзі нашай сітуацыі і пазней досыць цяжка паўплываць на яго змену. Да таго ж, шматлікія спрэчныя сітуацыі людзі могуць вырашыць самастойна, не звяртаючыся ў праваахоўныя органы. З гэтай главы Вы даведаецеся пра іншыя – несудовыя - шляхі вырашэння канфліктных сітуацый.***

**А.** Мы досыць часта чуем слова "канфлікт" , калі даведваемся, што нехта з некім пасварыўся, ці паспрачаўся. Некаторыя з вас чулі, што існуе цэлая навука пра спосабы вырашэння канфліктаў – канфліктaлогія. Многім з нас хацелася б дасканала валодаць гэтай навукай – майстэрствам вырашэння канфліктаў.



Канфлікты звычайна ўзнікаюць, калі некалькі асоб маюць розныя погляды на адну і тую ж праблему і пры гэтым усе яны лічаць сябе правымі. Напрыклад, калі ты выпадкова натыкнуўся на некага, выходзячы з-за вугла, яму здаецца што ты гэта зрабіў наўмысна. Ці, калі ты спрачаешся са сваёй сястрой ці братам па пытанню, якую зараз глядзець тэлеперадачу. Альбо калі твае бацькі лічаць, што твой магнітафон грае занадта гучна. Усё гэта – канфлікты. Канфліктамі таксама называюцца і такія сітуацыі, калі людзі парушаюць правы іншых – кажуць, уваходзяць у канфлікт з законам. Зразумела для вырашэння такіх канфліктаў ёсць спецыяльныя установы. Аднак, вельмі часта, хоць і не заўсёды, сітуацыю магчыма вырашыць і не звяртаючыся


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

да суда, ці міліцыі, а выкарыстоўваць гэтую магчымасць толькі ў скрайнім выпадку. Такім чынам канфлікты можна ўмоўна падзяліць на прававыя і неправавыя. Мы з вамі паспрабуем праанлізаваць асаблівасці вырашэння менавіта прававых канфлікаў і магчымасці іх несудовага вырашэння.

**Канфлікт – сутыкненне супрацьлеглых інтарэсаў, поглядаў; сур'ёзнае рознагалоссе, востая спрэчка.**

**Прававы канфлікт – сутыкненне супрацьлеглых інтарэсаў, заснаваных на парушэнні нормаў права і правоў асоб, якія ўдзельнічаюць у канфлікце.**

Вельмі важна, што прававы канфлікт, у адрозенні ад звычайнага, можа ўзнікнуць не толькі паміж асобамі ці групамі, якія залежаць адна ад адной, а таксама і паміж малазнаёмымі людзмі ці вогуле незнаёмымі раней. А вырашэнне спрэчнага пытання з'яўляецца аднолькава важным для абодвух бакоў. Звернемся яшчэ раз да гучнасці музыкі ў вашай кватэры. І для нас і для нашых бацькоў аднолькава важна вырашыць гэтую сітуацыю з найбольшай выгадай для сябе. І гэта будуць звычайныя сямейныя справы. А вось калі музыка, якая нясецца з вашай кватэры і днём і ноччу, перашкаджае спакойна існаваць суседзям – гэта ужо зусім іншая справа. Тут можна казаць аб парушэнні такіх нормаў права, якія рэгулююць грамадскі парадак ў начны час, гэта значыць з 22 да 6 гадзін, і забараняюць гучна ўключаць музыку, тэлевізар, рабіць рэмонтныя работы. Тут закранутыя правы суседзяў на адпачынак і спакойны лад жыцця. Яны могуць прыйсці да вас з прапановай зрабіць цішэй ці адразу пайсці да ўчастковага. І што лепш - не вядома. Для нас лепш не плаціць штраф, для іх лепш - спакойна спаць. Але і для нас і для іх важна не сварыцца з суседзямі. Таму, можа, ўсё ж паразмаўляць?

Канфлікты з'яўляюцца непазбежнай часткай нашага штодзённага жыцця. Мы павінны падрыхтавацца, што яны будуць суправаджаць нас на працягу ўсяго жыцця. Так здараеца таму, што ўсе людзі розныя, маюць розныя інтарэсы, розныя памкненні, розныя мэты і матывы для тых ці іншых паводзін. Да таго ж не заўседы гэта ўсё вядома для атачэння. Нашым суседзям можа быць абсалютна


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

абыякава, што да нас сёння прыехаў дарагі сябар і таму у нас весела і гучна далёка за поўнач. Часта здараецца так, калі мы некаму хочам давесці абсалютную, на наш погляд, ісціну, гэты чалавек раптам пачынае ўпірацца і злавацца. Нам гэта абсалютна не заразумела, а справа проста ў тым, што для гэтага чалавека нашыя прычыны здаюцца неважкімі. І так здараеца вельмі часта.

Звычайна мы лічым канфлікт праблемай, аднак ён можа быць і карысным. Калі канфліктам свядома кіраваць, то з яго магчыма шмат чаму навучыцца. І часам ён можа прывесці да пэўных дадатных вынікаў, якіх ніхто з удзельнікаў канфлікта і не спадзяваўся. Ёсць розныя спосабы пазбягання канфліктаў і, у прынцыпе, для кожнага ёсць свая тактыка ў гэтым. Але найбольш важным з'яўляецца пытанне не аб тым, як пазбегнуць канфлікта, а аб тым, як сябе ў ім паводзіць. Большасць людзей імкнецца панаваць у канфлікце, як кажуць - пакідаць за сабой апошняе слова, - іншыя лічаць для сябе лепшым у рэшце рэшт саступіць, некаторыя імкнуцца да кампраміса. Аднак найлепшым з'яўляецца ўзаемнае знаходжанне такога варыянта паводзінаў, калі задаволенымі застаюцца ўсе бакі канфлікта. Гэтага магчыма дасягнуць праз знаходжанне найлепшага спосаба яго вырашэння, які будзе прыняты канфліктуючымі бакамі.

**Б.** Калі мы сапраўды хочам паспяхова выйсці з канфліктнай сітуцыі, ў якой апынуліся, не нажыць большых праблемаў і да таго ж вынесці з яе нешта карыснае, то неабходна даведацца пра асноўныя крокі эфектыўнага ўрэгулявання канфліктаў.

***Першы крок*** да паспяховага вырашэння канфлікта – вызначэнне сутасці склаўшайся спрэчнай, канфліктнай сітуацыі.

Давайце прыгадаем канфліктную сітуацыю, што склалася паміж сп. Кашуком і сп. Пецуком з-за выпадка, які мы разглядалі ў мінулай главе, і паспрабуем вызначыць, у чым быў корань канфлікта паміж бакамі.

*Спачатку давайце вызначым бакі, якія былі ўцягнуты ў канфлікт. Як мы памятаем, гэта былі сп. Кашук, сп. Пецук і Васіль. Канфлікт пачаўся з таго, што сп. Кашук палічыў, што Васіль, сын сп. Пецука,*


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

*паламаў яго плот і звярнуўся ў суд для аднаўлення сваіх парушаных маёмасных правоў. У выніку, суд прымусіў сп. Пецука аднавіць плот і аплаціць судовыя выдаткі. Аднак наўрад ці сп. Кашук апынуўся ў выйгрышным становішчы, бо малаверагодна, што яго сусед не будзе дабівацца перагляду справы. Не кажучы ўжо пра сям'ю Пецукоў – іх судовае рашэнне, напэўна, аніяк не задаволіла. Таму, не гледзячы на тое, што суд вынес рашэнне,* ***канфлікт*** *паміж Кашуком і Пецукамі так і застаўся невырашаным.*

***Наступны, другі, крок*** у вырашэнні канфлікта -- вызначэнне і аналіз наяўных, ці па-іншаму – тых, якія яны выказваюць для атачэння - пазіцый і сапраўдных унутраных інтарэсаў бакоў. Давайце зробім гэта на прыкладзе нашага выпадка.

| ТАБЛІЦА 1 | Васіль | Сп. Пецук | Сп. Кашук |
|---|---|---|---|
| **Пазіцыі** (тое, што выказваецца бакамі) | - Ён баіцца пакарання.<br>- Ён не лічыць сябе вінаватым. | - Ён хоча, каб да Васіля паставіліся справедліва.<br>- Ён не хоча, каб Васіля паставілі на ўлік у міліцыю. | - Ён хоча, каб Васіля і яго бацьку пакаралі за тое, што зрабіў Васіль.<br>- Ён хоча, абараніць сваю маёмасць. |
| **Інтарэсы** (унутраныя матывы займання пэўнай пазіцыі ў канфлікце) | - Ён проста гуляўся і не хацеў ламаць плот.<br>- Ён не хоча сварыцца з суседзямі. | - Ён баіцца, што яму прыдзецца аплочваць вялікія судовыя выдаткі.<br>- Ён адчувае сабе часткова адказным за тое, што здарылася.<br>- Ён не хоча сварыцца з суседам.<br>- Ён хоча спакойна жыць у сваім раёне. | - Ён лічыць, што падлеткі павінны ведаць, што ім прыдзецца адказваць за свае дзеянні.<br>- Ён хоча спакойна жыць у сваім раёне. |

Калі мы сапраўды хочам вырашыць канфліктную сітуацыю, то нам неабходна паглядзець на яе вачыма другога бока і паспрабаваць адшукаць агульныя кропкі на ўзроўні задавальнення інтарэсаў усіх задзейнічаных асоб. У нашым выпадку агульныя інтарэсы бакоў – гэта ўзаемнае жаданне не сварыцца з суседзямі і спакойна жыць у сваім раёне. Калі бакі прыйдуць да высновы, што менавіта гэтыя інтарэсы з'яўляюцца для ніх галоўнымі, ёсць магчымасць


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

паспрабаваць вырашыць канфліктную сітуацыю не даводзячы яе да суда.

І, нарэшце, ***апошні, трэці, крок*** урэгулявання канфлікта – гэта выбар найбольш дзейснага ў дадзенай сітуацыі способа яго вырашэння. Існуюць наступныя варыянты вырашэння канфліктаў.

1. **НЕФАРМАЛЬНАЯ ДЫСКУСІЯ** – працэс, у якім людзі (асобы ці групы) сустракаюцца для абмеркавання канфлікта, які ўзнік паміж імі, без спецыяльных правіл паводзінаў пад час яе правядзення. Бакі ў канфлікце размаўляюць адзін з адным наўпрост. *Дадатным бокам гэтага спосабу вырашэння канфліктаў можна назваць тое, што бакі свабодныя ў выбары спосабаў, парадку і тэрмінаў дасягнення кансэнсуса, да таго ж захоўваецца канфедэнцыяльнасць сутнасці спрэчкі і няма патрэбы уводзіць у курс справы староннягa чалавека. Аднак, гэтыя плюсы смогуць аказацца ў пэўным сэнсе і мінусамі. Калі, напрыклад, канфліктуючыя асобы не умеюць самастойна прыходзіць да згоды і проста упіраюцца на сваім, не зважаючы на меркаванне другога боку. Часам бывае і такое, што людзі проста не умеюць слухаць адзін аднаго і дыскусія ператвараецца ў звычайную лаянку, калі ніхто нікога не чуе і не хоча гэтага рабіць. І выкананне прынятага бакамі рашэння будзе залежыць толькі ад іх добрай волі. Напрыклад, калі мы некаму пазычаем грошы і доўга не можам дачакацца звароту, цалкам можна выкарыстаць магчымасць і паразмаўляць з чалавекам. Магчыма, ён патлумачыць, якія у яго ўзніклі складанасці, і мы разам зможам прыдумаць шлях іх пераадолення, каб грошы ўсё ж такі былі звернуты.*



2. **ПЕРАМОВЫ** – працэс, у якім людзі размаўляюць адзін з адным наўпрост пра канфліктную сітуацыю паміж імі і самастойна

спрабуюць знайсці варыянт яе рашэння, з якім яны бы пагадзіліся. Перамовы маюць вызначаныя правілы правядзення. Магчыма правядзенне пісьмовых перамоваў або праз прадстаўнікоў бакоў, якія знаходзяцца ў канфлікце. *Гэты шлях вырашэння канфлікнай сітуацыі адрозніваецца ада папярэдняга менавіта тым, што мае вызначаныя правілы правядзення. Гэта спрашчае падтрыманне пэўнай дысцыпліны паміж удзельнікамі перамоваў. Здаецца, што шмат каму вядома, што гэта найбольш распаўсюджаны спосаб вырашэння розных спрэчных пытанняў паміж дзяржавамі, а значыцца і эфектыўнасць яго праверана на практыцы. Аднак, і тут можна знайсці свае недахопы. Напрыклад, пры перамовах ніхто не сочыць за тым, каб бакі прыйшлі да вырашэння канфлікта. Кантроль за выкананнем прынятага рашэння таксама, як і ў папярэднім выпадку, ускладаецца на сумленне перамоўцаў. Але ж за стол перамоваў варта сесці хаця б для таго, каб даведацца, якія прэтэнзіі мае супрацьлеглы бок.*

3. **МЕДЫЯЦЫЯ** – працэс, у якім незацікаўленая трэцяя асоба (медыятар) дапамагае канфліктуючым бакам знайсці рашэнне, якое б іх задаволіла. Медыяцыя мае дакладна вызначаныя правілы паводзінаў і з'яўляецца добраахвотнай і канфедыцыйнай. Канфліктуючыя бакі размаўляюць адзін з адным пры дапамозе медыятара. *Медыяцыя шырока распаўсюджаная ў замежных краінах і нават замацавана ў заканадаўстве. Там пры судовых установах спецыяльна працуюць медыятары, якія дапамагаюць людзям прыйсці да прымальнага рашэння канфлікту не даводзячы справы да суда. Хаця зварот да медыятара і не абавязвае бакі пазней не зварочвацца за вырашэннем той жа спрэчкі ў суд. Абавязковым зварот у суд*



*становіцца пры невыкананні рашэння, прынятага падчас медыяцыі. Гэта зроблена для таго, каб разгрузіць суд ад вялікай колькасці дробных спрэчак. Медыяцыя прадугледжаная, напрыклад, па такіх справах як дробнае хуліганства, дробныя крадзяжы, псаванне ці захоп чужой маёмасці, некаторыя справы па дарожна-транспартных здарэннях, сямейныя справы. На Беларусі пакуль німа такіх органаў, але закон дае магчымасць стварэння так званых трэцейскіх судоў. Гэта могуць быць проста вашыя суседзі і сябры, якія з боку незацікаўленай асобы паглядзяць на спрэчку і выкажуць вам свае меркаванні. На разгляд гэтых трэцейскіх судоў могуць быць вынесеныя такія ж справы, як і на разгляд прафесійных медыятараў.*

4. **СУДОВАЯ ПРАЦЭДУРА** – як мы ўжо ведаем, гэта працэс, пад час якога бакі або іх прадстаўнікі прадстаўляюць у судзе справу, якая тычыцца парушэння нормаў права. Рашэнне па ўрэгуляванню такога канфлікта прымаецца суддзёй, які выконвае самую актыўную ролю па высвятленню сутнасці справы. За выкананнем судовага рашэння сочаць адпаведныя дзяржаўныя органы. Уся працэдура рэгулюецца складанымі правіламі, апісанымі ў законе. Пра плюсы і мінусы гэтага спосаба вырашэння канфлікта мы з вамі размаўлялі ў папярэдняў главе. Нагадаем толькі, што пры звароце ў суд і разглядзе справы ў судзе абавязковасць выканання рашэння, якое было прынята па справе, не падлягае сумненню.

Гэтыя варыянты магчыма размяркаваць на своеасаблівай лініі, дзе злева знаходзяцца найменш, а справа – найбольш фармальныя, ці урэгуляваныя пэўнымі правіламі, спосабы вырашэння канфлікта. Іншымі словамі, злева знаходзяцца тыя варыянты, якія даюць магчымасць бакам вырашыць іх праблему самастойна, а справа – тыя, што патрабуюць знешняга ўмяшальніцтва:


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

## СПОСАБЫ ВЫРАШЭННЯ КАНФЛІКТАЎ

| НЕФАРМАЛЬНАЯ ДЫСКУСІЯ | МЕДЫЯЦЫЯ |
|---|---|
| **НЕФАРМАЛЬНЫЯ** | **ФАРМАЛЬНЫЯ** |
| ПЕРАМОВЫ | СУДОВЫ ПРАЦЭС |

Кожны з пералічаных спосабаў вырашэння канфлікта мае свае станоўчыя і адмоўныя бакі. Напрыклад, нефармальныя спосабы даюць магчымасць вырашыць праблему самімі канфліктуючымі бакамі, не выносячы "смецця з хаты". Да і напэўна можна пагадзіцца з тым, што вучыцца ўрэгуляванню сваіх стасункаў з іншымі людзьмі і законам лепей па-за межамі залы суда. Аднак і выкананне рашэння, прынятага нефармальным спосабам, будзе базавацца толькі на сумленні асоб, якія да яго прыйшлі. У той самы час фармальныя метады звычайна падключаюць да вырашэння тваёй праблемы большую колькасць пабочных асоб, магчыма і тых, якіх бы ты не жадаў пасвячаць у сутнасць справы (бацькі, настаўнікі). Але гэтыя спосабы даюць табе большыя гарантыі выканання прынятага рашэння, бо яно будзе выконвацца пад наглядам з боку тых, хто ўдзельнічаў у яго прыняцці.

Усе гэтыя спосабы вырашэння канфліктаў, акрамя судовага, могуць з посьпехам выкарыстоўвацца і для вырашэння неправавых канфліктаў. Калі вы не можаце прыйсці да парузумення па нейкаму пытанню з бацькамі, настаўнікам ці, нават, з сябрамі паспрабуйце арганізаваць, напрыклад, перамовы па правілах. Ці паклічце на дапамогу "медыятара" – можа быць, старэйшага брата свайго суседа зверху. Магчыма гэта дапаможа вам хучэй прыйсці да згоды

Такім чынам, перад тым, як прадпрымаць дзеянні па вырашэнню спрэчных сітуацый, з якімі мы сустракаемся ў сваім жыцці, паспрабуем ўзгадаць пра тыя крокі, якія неабходныя для эфектыўнага іх ўрэгулявання: вызначэнне сутнасці канфлікта, аналіз пазіцый і інтарэсаў бакоў і знаходжанне найлепшага спосаба яго вырашэння. І трэба заўсёды памятаць, што існуе шмат канфліктаў, звязаных з парушэннем нормаў права, якія можна вырашыць не


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

карыстаючыся дапамогай судоў, міліцыі, пракуратуры і іншых дзяржаўных органаў.

**Хатняе заданне:**

1. Ўзгадайце сітуацыю сп. Пецука і сп. Кацука (гл. главу "Судовая абарона").
2. Вызначце пазіцыі і інтарэсы бакоў у гэтым канфлікце, карыстаючыся табліцай 1.
3. Які спосаб вырашэння канфлікта лепш за ўсё ўжыць для ўрэгулявання гэтай сітуацый? Чаму? Адзначце адказы у сшытку.
4. Які спосаб выхаду з дадзенага канфлікту будзе мець найменшы эфект? Чаму? Адзначце адказы ў сшытку.


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

# ЗАЎВАГІ

*Шаноўныя чытачы! Калектыў аўтараў будзе вельмі Вам удзячны за заўвагі і прапановы па ўдасканаленню гэтага падручніка. Калі ласка, пакіньце свае водгукі па кожнай главе.*

## Правілы

## Сацыяльныя нормы


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

## Прававыя і неправавыя законы

## Як ствараюцца законы


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

## Як выконваюцца законы. Абскарджанне незаконных дзеянняў чыноўнікаў

## Як можна паўплываць на змену закона


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

## Зварот да юрыста

## Судовая абарона

## Вырашэнне канфліктаў


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

Навучальнае выданне

# ПРАВА НА КОЖНЫ ДЗЕНЬ

ПАДРУЧНІК

**Клімчук Наталля Аляксандраўна, Кузьмініч Ігар Расціслававіч, Пісаркова Юліана Ўладзіміраўна, Салей Сяргей Міхайлавіч, Хацук Павел Аляксандравіч**

**Мастацкае аздабленне**: А. Гайса, Н. Клімчук

Здадзена ў набор Падпісана да друку
Фармат 60х84/8. Папера Xerox.
Афсетны друк. Гарнітура School Book.
Ум. Друк. Арк. 4,8. Ул - выд. Арк. 4,0.
Наклад ас.

Распаўсюджваецца бясплатна



*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*